Камуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СТУДЗЕНЬ 26 1934 г. ПЯТНІЦА № 21 (4854) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Дзяржаўная бібліятэка імя В. І. Леніна — Абл-ка библ-ка и библиотекования 2-31 г.

СЕННЯ У НУМАРЫ

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ БЕЛАРУСІ ЗРАБІЦЬ ПЕРАДАВОЙ У СОВЕЦКІМ САЮЗЕ. ПРАФ. БАХЦЕЕЎ — ЛЕНІН АБ ТОРФЕ. АКАДЭМІК А. Н. БАХ — ХІМІЮ НА СЛУЖБУ СОЦЫЯЛІЗМУ. — ГРЫНГЛАЗ І БЕЛКІН — РАШУЧА ПАКОНЧЫЦЬ З ІГНАРАВАННЕМ АГРАТЭХНІКІ.

ПАСТАНОВА ЦВК І СНК СССР АБ ЗБОРЫ НА ПАТРЭБЫ ЖЫЛЛЕВАГА І КУЛЬТУРНА-БЫТАВОГА БУДАЎНІЦТВА Ў ГАРАДАХ І СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ НА 1934 ГОД.

ЗА МЯЖОЙ:

БАРАЦЬБА ЗА ЦІХІ АКЕАН.

ВАКОЛ АДСТАЎКІ АРАКІ.

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ЗА МЯЖОЙ.

СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ БЕЛАРУСІ ЗРАБІЦЬ ПЕРАДАВОЙ У СОВЕЦКІМ САЮЗЕ

Прамова тав. СТАЛІНА аб работы ў вёсцы на студзеньскім пленуме ЦК, лозунг аб калгаснай замоцы паварнулі ўсю партыю тварам да задач соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі, кінулі мільёны мас калгаснікаў на барацьбу з кулацкімі, шкодніцкімі, культайскімі элементамі, на барацьбу за чэсную працу і ахову калгаснай маемасці.

Пасланцы партыі ў вёсцы — парадзелы здолелі арганізаваць калгасныя масы, накіраваць іх дзейнасць на барацьбу за арганізацыйна-гаспадарчае і палітычнае умацаванне калгасаў і паспяховае правядзенне ўсіх сельскагаспадарчых работ.

Высокі ўраджай 1933 года стварыў усе неабходныя ўмовы для дальнейшага ўздыму соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Не менш 9 цэнтнераў зерневых, не менш 2,5 цэнт. ільну і 130 цэнт. бульбы з гектара ў 1934 годзе — вось задані партыі і ўрада, выкананне якога з'яўляецца баявым абавязкам, даваў гонару для калгасаў, МТС, калгасаў і ўсіх партыйных і совецкіх арганізацый.

Для паспяховага выканання гэтай задачы мы маем усе неабходныя ўмовы. «Мы па механізацыі 1934 годзе будзем займаць адно з першых месц у СССР. Мы будзем мець у БССР больш 3.000 трактароў, будзем мець 81 МТС. Мы ў 1934 г. будзем мець дастатковую колькасць хімічных угнаенняў. У 1934 годзе будзем мець цэлы рад новых сур'ёзных матэрыяльных рэсурсаў, якія дазволяць нам рушыць наперад больш хутка» (Гікало).

Зараз больш чым калі-б там ні было справа залежыць ад нас, ад нашага правільнага, канкрэтна і аператыўна кіраванне гаспадаркай і дасягнуць скарыстаць [illegible] сапраўдныя ўмовы. Якасна [illegible] кіраўніцтва будзе выражаць вынік барацьбы за высокі ўраджай у 1934 годзе.

ПАСТАЯННАЯ ВЫТВОРЧАЯ КАЛГАСНАЯ БРЫГАДА АДЫГРАВАЕ ВЕДУЧУЮ РОЛЮ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ЦВЕРДЫ ПАРАДАК У КАЛГАСЕ, ЗА УСТАНАЎЛЕННЕ ЦВЕРДАЙ ПРАЦОЎНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ НА АСНОВЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ ЗАГАДАЎ ПРАЦЫ, ЗААХВОЧВАННЯ ЛЕПШЫХ І ПАДЦЯГВАННЯ ТАЛЫХ.

Там, дзе кіраўніцтва МТС, работы калгаса паболышэвіцку выконвае рашэнні партыі і ўрада аб арганізаванні пастаяннай калгаснай брыгады, там дзе брыгада стала асноўным звяном калгаснай вытворчасці, там мы ўжо зараз маем лучшыя поспехі ў падрыхтоўцы да сапраўднай веснавой пасеўнай кампаніі, у барацьбе за лішнюю тысячу высокі ўраджай будучага года.

Калгас «ЛАЎРЫНАЎКА» (Арэнчычна), дзе падрыхтоўка да вясны скандэнтравана выключна ў брыгадах, хоць сёння можа выязджаць у поле. І гэта не выключэнне. Як правіла, там, дзе за падрыхтоўку да вясны адказвае непасрэдна брыгада, якасць усіх работ значна вышэй.

Але ў пераважнай большасці калгасаў БССР са скандэнтрыраным асенняй палявых работ брыгады страцілі сваю ўстойлівасць, а ў радзе [illegible] яны зусім распушчаны да вясны. Дзе-ні-дзе нават і сярод [illegible] работнікаў існуе «тэорыя», што наогул брыгада зімой [illegible] адзінка непатрэбна. У выніку большасці калгасаў падрыхтоўка да сяўбы абязлічана, брыгады [illegible] свой гаспадарчы арганізацыйны твар.

ПАСЛАБЛЕННЕ БРЫГАД З'ЯЎЛЯЕЦЦА АСНОЎНАЙ ПРЫЧЫНАЙ ТАГО, ШТО Ў МНОГІХ РАЁНАХ БССР ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ ПРАХОДЗІЦЬ ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

Усе раёны адрапартавалі аб сто процантнай засыпцы насенных фондаў і на гэтым супакоіліся. Фактычна-ж ва многіх раёнах больш часць насення засыпана неачышчаным. Напрыклад, у БАБРУЙСКІМ і КЛІМАВІЦКІМ раёнах ачышчана не больш 50 проц. засыпанага насення.

Аслаблонне брыгад адбілася на тэмпах і асабліва якасці рамонта сельскагаспадарчага калгаснага інвентара. Прыёмка адрамантаванага інвентара часта праходзіць без удзелу брыгадзіраў.

Больш за ўсё перапяць ад гэтай абязлічкі конні. Толькі тым, што конні не замацаваны за брыгадамі і паасобнымі калгаснікамі, можна тлумачыць той факт, што ў калгасе «КОЛАС» (Бабруйшчына) пры наяўнасці дастатковай колькасці кармоў, 9 коняй ужо выйшлі са строю.

Асноўнай умовай ліквідацыі нашага адставання ў падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі з'яўляецца неадкладнае ўмацаванне пастаянных калгасных брыгад. За брыгадай павінны быць замацаваны не толькі ўчасткі зямлі ў палях севазвароту, але і ўвесь неабходны інвентар. Брыгада на чале з брыгадзірам павінна адказваць за поўную спраўнасць збруі, калёс, машын.

Цягавая сіла павінна быць прымацавана да брыгад, а ўнутры брыгады да кожнага асобнага калгасніка. Асобы нагляд трэба ўстанавіць за слабасільнымі коньмі, за жарэбнымі маткамі, вызваліўшы іх часткова або поўнасцю ад работы, паставіўшы на ўзмоцненую падкормку.

Брыгада павінна ўзяць пад свой кантроль насенныя фонды і забяспечыць высокаякаснае іх захаванне. Для ўстанаўлення моцнай дысцыпліны ў брыгадзе, павышэння матэрыяльнай зацікаўленасці брыгады і кожнага калгасніка ў выніках сваёй працы, неабходна з карэнтам выкарчаваць кулацкую ўраўнілаўку ў размеркаванні даходаў.

Брыгада — асноўнае звяно ў арганізацыі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Лепшыя калгаснікі-ўдарнікі сваім асабістым прыкладам павінны паказаць, што прымацаванне калгасніка да каня, да плуга не навучаецца, а толькі пачынаецца падрыхтоўка да вясны, што толькі тая брыгада здолее паболышэвіцку падрыхтавацца да вясны, дзе кожны калгаснік штодзённа клапоціцца аб прымацаваных да яго конях, правярае гатоўнасць інвентара, становішча насенных матэрыялаў і рыхтуе сябе, і гэтым самым і ўсю брыгаду, да баявых веснавых дзён.

Закончыўшыйся XV з'езд КП(б)Б са ўсёй вострасцю паставіў задачы далейшай барацьбы партарганізацый за соцыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі. Па большэвіцку ўзяцца за выкананне гэтых рашэнняў — первейшы абавязак усіх партарганізацый.

Пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый і палітадзелаў, умацоўваючы большэвіцкае адзінства і дысцыпліну ў брыгадах, разгортваючы соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, калгасы БССР здолеюць выканаць наказ кіраўніка большэвікоў Беларусі т. ГІКАЛО аб тым, каб 1934 год быў рашаючым годам, «РАШАЮЧЫМ У ТЫМ СЭНСЕ, КАБ СЕЛЬСКУЮ ГАСПАДАРКУ БЕЛАРУСІ ЗРАБІЦЬ САПРАЎДЫ ПЕРАДАВОЙ ГАСПАДАРКАЙ У СОВЕЦКІМ САЮЗЕ».

ЯКАСЦЬ РАМОНТА ТРАКТАРАЎ — ПАД НЕАСЛАБНЫ КАНТРОЛЬ

АГІДНАСЦІ У МЕНСКАЙ МАШЫНА-РАМОНТНАЙ МАЙСТЭРНІ

(АД МЕНСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА „ПРАВДЫ")

Менская машынарамонтная майстэрня павінна адрамантаваць соўгасам 247 трактараў і матораў. З самага пачатку рамонтнай кампаніі майстэрня не працавала. Заключылі дагаворы з соўгасамі, вербавалі рабочую сілу, заканчвалі набудову і абсталяванне механічна-зборачных цэхаў, складалі планы і графікі работ. Падрыхтоўка да рамонта працягнулася да лістапада. Гэта абавязвала кіраўніцтва майстэрняй у лістападзе і снежні разгарнуць работу. Аднак, гэтага не было.

Да студзеня 1934 г. майстэрня выканала толькі 36 проц. плана работ. Аб якасці работ гаворыць часты зварот трактараў і матораў на паўторны рамонт. Пераробкі дэталяў, паўторны рамонт за лістапад і снежань складалі да 50 порц. усіх работ.

Паводле слоў тэхнічкага дырэктара Герасімовіча, са студзеня ў майстэрні наступіў нібыта пералом. Але паміж словамі і сапраўднасцю — дыстанцыя агромнага памеру. З 1-га па 17-е студзеня майстэрня выпусціла з рамонта трактараў «ХТЗ» — 3 шт. замест 11 па графіку, «ФП» — 7 замест 16, матораў «ХТЗ» 16 замест 22, «ФП» — 20 — замест 30. І гэта называецца пераломам!

У чым-жа справа? Майстэрня мае павелічанае новае абсталяванне. Рабочых зусім дастаткова. Уся бяда ў тым, што кіраўніцтва майстэрняй не арганізавала работы, ліберальнічае з бракаробамі і прагульшчыкамі. У майстэрні няма кантролю за работай пэхаў і брыгад. Няма тэтага кантролю і ўнутры саміх брыгад. Масава-растлумачальная работа не праводзіцца. Няма клопатаў аб бытавых умовах для работных.

Брыгада Будрыка адрамантавала трактар «ФП» № 19121 соўгасу імя Сталіна. Пры дэтальнай праверцы аказалася, што ў пятым трактары ў нізкай частцы каркуха не задзелана трэшчына і прапякае масла.

Брыгада Паўловіча па зборцы трактараў няправільна сабрала чатыры трактары. Гэту работу цяпер перарабляе другая брыгада.

Залічэнцы падпышчыкаў Казакоў і Курбакаў, параней-шаму, даюць брак, а трыкутнік майстэрні ўсе гэтыя агіднасці толькі фіксуе на чорнай дошцы.

Слесар Краўчэнка з 18-га студзеня тры дні не выходзіў на працу. Слесар Бродзік 18-га студзеня спазніўся на 20 мінут. Бракераўшчык Біткін 19-га і 20-га студзеня спазніўся на 30 мінут. Так і мільгаюць на табелі пявыхады, спазненні, «хваробы». І ўсё гэта лічыцца нармальнай з'явай, а ў асобных выпадках нават патураецца дырэктарам.

Масавая работа з рамонтнікамі не праводзіцца. Ёсць адзін палітычны гурток, і той працуе нерэгулярна. Якая масава-выхаваўчая работа сярод рабочых і як працуе рабфак, відаць з таго, што з 84 рабочых толькі 8 ударнікаў. У майстэрні быў не дрэнны клуб. Але ён зараз занят пад інтэрнат.

Сталовая падобна на праходны двор. Праз сталовую сотні людзей штодзень праходзяць у склад, дзе валоўваюцца запасныя часткі. У такіх-жа ўмовах і кухня.

За работу і становішча менскай машынарамонтнай майстэрні павінен адказваць упоўнаркомсоўгасаў па БССР. Ці ведаў ўпоўнаважаны, што майстэрня не падрыхтавалася да зімняга рамонта трактараў? Ведаў і павінен быў ведаць.

На працягу трох месяцаў цягнецца перадача майстэрні ад Мінметалпрамтрэста ў ведамасць упоўнаркомсоўгасаў па БССР. На працягу гэтага доўгага перыяду майстэрня знаходзіцца без гаспадара, бесперыпетальная. І да гэтага часу яшчэ не вырашана пытанне: чыя-ж майстэрня, хто яе гаспадар і хто нясе за яе адказнасць? Упоўнаркомсоўгасам БССР у адным выпадку прызнае гаспадаром сябе, у другім (калі справа ідзе аб зрыве работы) прызнае яе гаспадаром Мінметалпрамтрэст на той падставе, што прыёмка майстэрні яшчэ не закончана.

Паўстае пытанне, калі-ж спыніцца ведамственная перапіска, калі і хто, нарэшце, пачне аператыўна, паболышэвіцку кіраваць работай менскай машынарамонтнай майстэрні? («ПРАВДА»).

Прынятыя маторы вышлі са строя

Гомель (Ад нашага спецкора).

Спаборніцтва Менск—Гомель—Віцебск на лепшую падрыхтоўку трактарнага парка да вясны ў Гомелі яшчэ не ператворана ў канкрэтную баявую справу.

Праўда, буйнейшыя заводы горада аказваюць МТМ актыўную дапамогу. Заводы імя Ланцуцкага, Гомсельмаш, «Рухавік рэволюцыі», «Пролетарый» выканваюць узятыя на сябе абавязацельствы па вырабу гільз, поршняў і інш. запасных частак.

Аднак, вельмі мала зроблена для арганізацыі правільнай работы ўнутры Гомельскай МТМ. Апартуністычнае кіраўніцтва МТМ на чале з дырэктарам Шляхценка нічога не робіць для выкарыстання ўсёй гэтай дапамогі.

МТМ адчувае вострую патрэбу ў гільзах ХТЗ. Завод імя Ланцуцкага абавязуецца іх адліць, а завод «Пролетарый» абтачыць, але тав. Шляхценка дагэтуль яшчэ не сабраўся паслаць на завод форму гільзы ХТЗ.

З буйнейшых прадпрыемстваў горада вылучаны інжынеры для тэхнічнага кіраўніцтва рамонтам. Але тав. Шляхценка ніяк не можа сабрацца прыцягнуць іх да работы.

У выніку такога «кіраўніцтва» план рамонту трактароў зрываецца па колькасных і якасных паказальніках.

З 147 матораў на 23 студзеня адрамантавана толькі 69. Па графіку МТМ павінна штодзённа адрамантоўваць 3 маторы. Але графік зрываецца.

Паводле загада НКЗ МТМ у першую чаргу павінна адрамантаваць трактары Гомельскай, Хойніцкай і Рэчыцкай МТС. А кіраўніцтва МТМ ігнаруе гэты загад. МТМ недадала першачарговым заказчыкам 18 матораў.

Але справа не толькі ў гэтым. Асабліва дрэнна з якасцю рамонту. Дырэктар МТМ тав. Шляхценка ганарыцца тым, што яшчэ не было выпадку, каб хто забракаваў адрамантаваны матор.

Прыёмачныя камісіі сапраўды прышлі амаль усе адрамантаваныя маторы. Але гэтыя камісіі па дыпмі да праверкі несур'ёзна. Гэтымі днямі абваліўся бабіт з трох прынятых матораў. Прынятыя маторы ХТЗ аказаліся з вялікімі дэфектамі. Рад падшыпнікаў адразу перагарае.

Гэта з'явілася выніжам таго, што прыёмка работ і праверка матораў не наладжана як след. Тэхнічнага кантролю няма. Бракераўкі таксама. Кожны працуе як хоча і здае прадукцыю, якую захоча.

Усё гэта прывяло да вельмі нізкай якасці рамонту. Маторы на трэці-чацверты дзень работы вернуцца назад у майстэрні.

У майстэрні адсутнічае правільная арганізацыя тэхналагічных працэсаў. Інжынер з сектара рамонту і эксплаатацыі НКЗ тав. Свечнікаў, які прыбыў з Менска, нічога канкрэтнага для арганізацыі работы ў МТМ не зрабіў. Прыехаўшы ў Гомель 16 студзеня, Свечнікаў сабраўся 19-га ўжо ўцячы назад у Менск. Такімі гастрэлёрскімі наскокамі работнікаў НКЗ работу ў МТМ не наладзіць.

Гомельская МТМ пры дапамозе буйнейшых прадпрыемстваў горада мае ўсе магчымасці для таго, каб датэрмінова і высокаякасна закончыць рамонт. Трэба толькі паболышэвіцку перабудаваць сістэму арганізацыі працы ў МТМ, трэба каб кіраўніцтва МТМ замест ашуканства стала на шлях рашучай барацьбы за якасць рамонту.

Л. К.

ЗВОДКА

аб ходзе рамонта трактараў па МТС БССР на 25 студзеня 1934 г.

МТС	Адрамантавана	Проц. выканан.
Клімавіцкая	37	100,0
Заслаўская	27	100,0
Цялушская	29	100,0
Стара-Дарожская	31	100,0
Буда-Кашалеўская	21	00,0
Гомельская	16	88,9
Рагачоўская	22	78,6
Слуцкая	25	73,5
Крычаўская	13	72,2
Глуская	2	66,7
Магілеўская	15	62,5
Любаньская	10	62,5
Ветрынская	25	62,5
Старобінская	11	61,1
Чавуская	11	57,9
Менская	16	57,1
Плешчаніцкая	12	57,1
Тураўская	6	54,5
Капыльская	15	53,6
Касцюковіцкая	8	53,3
Мехаўская	8	53,3
Бялыніцкая	12	48,0
Лоеўчыцкая	7	46,7
Полацкая	11	44,0
Вушацкая	9	42,9
Віцебская	9	39,1
Лепельская	14	36,8
Чашніцкая	8	36,0
Расонская	10	33,3
Лагойская	7	33,3
Крупская	6	30,0
Гарадоцкая	9	30,0
Вуздзенская	6	30,0
Путчынская	6	28,6
Жлобінская	6	27,3
Бягомльская	5	25,0
Сіроцінская	8	24,2
Рэчыцкая	7	24,1
Дрысенская	5	23,8
Аршанская	6	23,1
Смалявіцкая	8	22,9
Бешанковіцкая	7	21,2
Сенненская	7	20,6
Дзяржынская	9	19,6
Суражская	5	19,2
Шклоўская	7	17,5
Борнгавіцкая	4	17,4
Асвейская	5	16,1
Барысоўская	3	14,3
Терахоўская	4	14,3
Даманавіцкая	4	13,3
Дубровенская	4	10,0
Пухавіцкая	3	10,0
Жыткавіцкая	1	4,8
Танежыцкая	1	3,3
Мсціслаўская	1	2,7
Большэвіцкая	—	—
Лёзненская	—	—
Талачынская	—	—
Горацкая	—	—
Хойніцкая	—	—
Усяго па МТС	589	35,9

ЗВОДКА

аб ходзе рамонта трактараў і матораў па МТМ на 20 студзеня 1934 г.

МТМ	Адрамантавана	Проц. выканан.
Рагачоўская	108	78,8
Клімавіцкая	73	76,8
Слуцкая	129	62,9
Горацкая	50	62,5
Гарадоцкая	53	52,5
Гомельская	67	46,2
Лепельская	59	45,0
Дзяржынская	63	40,1
Аршанская	66	32,2
Даманавіцкая	32	25,0
Полацкая	20	24,4
Віцебская	19	16,8
Разам па МТМ	739	46,8

БАРАЦЬБА ЗА ЦІХІ АКЕАН

СІНГАПУРСКАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

ВОДГУКІ ПАЗШ

НЬЮ-ЙОРК, 24 студзеня. (БЕЛТА). Амерыканскі друк аддае вялікую ўвагу сінгапурскай канферэнцыі. Газеты падкрэсліваюць антыяпонскае астрыё канферэнцыі. Сімс — рэдактар замежнага аддзела газеты «Трэста Скрыпс-Говард» указвае, што захватніцкая палітыка Японіі на Далёкім Усходзе выклікала трывогу ў Вашынгтоне, Лондане, Парыжы, Рыме і Маскве.

«Апасаюцца, — піша Сімс, — што Японія не задаволіцца захватам Манчжурыі, а прадоўжыць яшчэ больш небяспечныя авантуры ў Азіі. Паведамляюць, што Антлія, апасаючыся за бяспечнасць Індыі, Аўстраліі і Новай Зеландыі, гарантавала бяспечнасць Галандскай Індыі. Сінгапурская канферэнцыя абмяркуе мерапрыемствы па абароне англійскіх уладанняў.

Аўстралія і Новая Зеландыя ўстрывожаны апошнімі падзеямі на Ціхім акіяне. Прапанова аб уходзе ПАЗШ з Філіпін узмацніла іх непакой. Сінгапурская канферэнцыя амаль прыняла рашэнне аб паскарэнні будаўніцтва сінгапурскай базы».

КАМЕНТАРЫІ ФРАНЦУЗСКАЙ ПРЭСЫ

ПАРЫЖ, 24 студзеня. (БЕЛТА). Увесь друк паведамляе аб адкрыцці англійскай ваенна-морскай канферэнцыі ў Сінгапуры. Лонданскі карэспандэнт «Эко дэ Пары» піша: «Хоць рашэнні канферэнцыі і хаваюцца ў тайне, можна было іх загадзя прадбачыць. Англійскае адміралтэйства парашыла неадкладна павялічыць свае морскія і паветраныя сілы ў Ціхім акіяне. Гэтых сіл цяпер зусім недастаткова для абароны Аўстраліі, Новай Зеландыі, Ганконга і іншых уладанняў Англіі, раскіданых на агромнай адлегласці адно ад другога. Англія мае паміж астравамі Філіпінскі і Бенгальскім праліваў толькі 13 крэйсераў, 14 знішчальнікаў, 12 падводных лодак і адзін авіяносец. Патрэбны тыдні, пакуль у Ціхі акіян падыйдуць другія броненосцы, бо остраў Мальта, дзе стаіць першая баявая эскадра, знаходзіцца за 10 тыс. клм. ад Сінгапура. Сілы японскага флота значна выраслі, а флот ПАЗШ у хуткім часе павялічыцца амаль у два разы. Вось чаму непакой Аўстраліі вельмі паказальны. Урад ужо парашыў умацаваць порт Дарвіна і павялічыць усю эскадру на 2 крэйсары».

АНГЛА-ГАЛАНДСКАЯ МОРСКАЯ ЗГОДА

ШАНХАЙ 24 студзеня. (БЕЛТА). Кітайскія палітычныя колы аддаюць выключную ўвагу морскай канферэнцыі ў Сінгапуры. У сувязі з канферэнцыяй вялікая ўвага аддаецца паведамленню агенцтва «Сімбун рэнто», што паміж Англіяй і Галандыяй заключана «тайная морская згода».

Па гэтай згодзе Англія гарантуе цэласнасць галандскіх уладанняў у Індыі, а брытанскія морскія сілы ў Сінгапуры бяруць на сябе іх абарону.

Кітайскія колы ўказваюць, што гэта згода накіравана супроць планаў японскіх імперыялістаў у Індыі. Пры гэтым падкрэсліваюць, што японскія нафтавыя канцэсіі ў Індыі з'яўляюцца важнай крыніцай снабжэння запасам японскага флота.

ВАКОЛ АДСТАЎКІ АРАКІ

АЦЭНКА ЯПОНСКАЙ ПРЭСЫ

ТОКІО 24 студзеня. (БЕЛТА). Большасць газет у перадавых артыкулах ухваляюць уход Аракі з урада Саіто. Газеты падкрэсліваюць сваё задаваленне тым, што ўход Аракі не выклікаў падзення ўрада Саіто і што, з прычыны адсутнасці Аракі, на парламенцкай сесіі не будзе вострых дэбатаў па пытаннях, якія закранаюць армію.

«Хоці» выказвае надзею, што новы ваенны міністр будзе ўстрымлівацца ад умяшання ў праблемы грамадзянскай адміністрацыі, і, значыць, палепшацца перспектывы ўрада Саіто».

«Цутай сіогіо» думае, што «паколькі Аракі добра ведалі за граніцаю, яго адстаўка можа выклікаць вялікія перамены ў палітычным свеце».

«Кокумін», наадварот, — указвае, што ў экстрэмістскіх колах адчуваецца спакойна да змены ваеннага міністра, бо лічаць, што гэта змена «не выкліча змяненняў у палітыцы армії» і, у прыватнасці, змянення ў бюджэце 1934-35 г.

Цікава, між іншым, што пасля адстаўкі Аракі курс некаторых цэнтраў на такійскай біржы падняўся на 3-4 пункты, а курс акцый раду прадпрыемстваў ваеннай прамысловасці ўпаў на 2-3 пункты.

ЛОНДАНСКІ РЭЗАНАНС

ЛОНДАН, 24 студзеня. (БЕЛТА). Такійскія карэспандэнты ўсіх кансерватыўных газет падкрэсліваюць, што адстаўка Аракі не азначае змянення палітычнага курсу Японіі. Карэспандэнт «Дэйлі мейль» указвае, што назначэнне Хаясі разглядаецца, як «перамога ваенных колаў». Карэспандэнт «Таймс» падкрэслівае «адсутнасць перамен у вярхоўным кіраўніцтве арміі».

«Н'юс кронікл» заяўляе, што было-б удзенна, калі-б можна было разглядаць адстаўку Аракі, яд адмаўлення Японіі ад яе ваяўнича-шавіністычнай палітыкі.

Аднак, паводле слоў газеты, «назначэнне Хаясі, на жаль, робіць такую перспектыву вельмі праблематычнай». Газета спадзяецца толькі, што эканамічнае становішча падштурхне Хаясі прытрымлівацца больш умеранай палітыкі, чым тая, якой трымаўся Аракі.

Заява АРАКІ

ТОКІО, 24 студзеня. (БЕЛТА). Каментуючы назначэнне Хаясі, былы ваенны міністр Аракі ў інтэрв'ю заявіў, што «становішча Японіі вельмі цяжкае» як з пункту гледжання ўнутранага, так і міжнароднага становішча.

Аракі падкрэсліў тэндэнцыю к далейшаму пагаршанню становішча Японіі і ўказаў, што адсюль усякая памылка ў ажыццяўленні адміністрацыйнай палітыкі можа прывесці да наследстваў, якія прадстаўляюць сабой «пачатак крушэння добрабыту краіны». Аракі заявіў, што ён вельмі рад і спакойны па поваду таго, што яго прыемнікам прызначан Хаясі, «якога ён паважае і якому давярае».

ІНТЭРВ'Ю ХАЯСІ

ТОКІО, 24 студзеня. (БЕЛТА). Учора Хаясі ў першым інтэрв'ю прадстаўнікам друку заявіў, што ён поўнасцю падтрымлівае пункт гледжання Аракі аб становішчы Японіі. Хаясі заклікае к адзінству для перамагання труднасцей.

ЯПОНСКІЯ ПАГРОЗЫ КІТАЙСКІМ ГАЗЕТАМ

БЕЙПІН, 24 студзеня. (БЕЛТА). Рэдакцыі буйнейшых кітайскіх газет у Паўночным Кітаі атрымліваюць пагражаючыя лісты ад японскіх арганізацый, як «Клуб вялікай Японіі», «Ліга вялікай Азіі» і інш., у якіх прапануецца не публікаваць паведамленняў непрыяльных для Японіі і Пу-І.

БЕЙПІН, 24 студзеня. (БЕЛТА). Паводле слоў «Цзяньцзін Іншыбао» японскія агенты нанялі звыш 100 кітайцаў, якім даручана атручваць студні ў раёне размяшчэння арміі генерала Ван І-цзе недалёка ад Цзяньцзіна, з мэтай атручвання салдат.

ТЭРОР ІШПАНСКАЙ РЭАКЦЫІ

ПАРЫЖ, 24 студзеня. (БЕЛТА). Як паведамляюць з Мадрыта, у выніку апошніх масавых арыштаў лік рэвалюцыйных палітзняволеных у Іспаніі дасягнуў 14 тысяч.

Настойваючы на ўзмацненні рэпрэсій, рэакцыйныя колы спекулююць на тым, што нібы, рэвалюцыянерамі ў дні снежаньскага паўстання было падпалена чынгачнае палатно на масту каля Песоля, у выніку чаго выйшлі з рэек валенсійскі экспрэс і было забіта шмат пасажыраў. Выступаючы ў парламенце камандэнтар Болівар указаў, што гэта катастрофа — такая-ж правакацыя, як і падпал германскага рэйхстага. «Вы, толькі вы сапраўдныя віноўнікі гэтага крушэння», — выкрываў з парламенцкай трыбуны Болівар, звяртаючыся да дэпутатаў — фашыстаў і манархістаў.

На аснове да гэтага часу не знятага надзвычайнага становішча, на якім абвешчана ўся краіна, астаюцца запячатанымі дзверы ўсіх рэвалюцыйных рабочых арганізацый.

Паранейшаму не выходзяць комуністычныя і анархо-сіндыкалісцкія газеты. Забаронен выхад новай антыфашысцкай і антыфашысцкай юнацкай газеты «Аксіон». Орган адзінага рабочага фронта — штодзённая газета «Ла Луча» — падпадае пастаянным цэнзуры і канфіскуецца на радзе яшчэ ў друкарні.

СОВЕЦКІЯ МАТРЫЦЫ

МАСКВА. (БЕЛТА). Совецкае машынабудаўніцтва зробіць у гэтым годзе буйны крок наперад у тэхнічным узбраенні паліграфічнай прамысловасці. Тры заводы імя Макса Гельца ў Ленінградзе, імя Фрунзе — у Рыбінску, імя КПГ у Маскве, выпусцяць друкарскіх машын на 15,5 млн. руб. — у два разы больш чым у мінулым годзе.

Завод Макса Гельца прыступіў да серыйнага выпуску лінатыпаў, першыню асвоеных ім у мінулым годзе. Усяго ён выпусціць 100 лінатыпаў супроць 29 у 1933 годзе.

ЗАВОД ЗГАТОВІЦЬ ТАКСАМА 300 КАМПЛЕКТАЎ МАТРЫЦ ДЛЯ ЛІНАТЫПАЎ. Да гэтага часу яны ў Саюзе не выраблялісь. На кожны лінатып краіна штогод імпартавала матрыц на 250 залатых рублёў.

Завод таксама даюць 20 малых ратацыйных машын з стэрэатыпным абсталяваннем. У мінулым годзе завод Ягоды згатовіў першую 4-х рулёвую ратацыю для «Праўды». У гэтым годзе ён зробіць 6 такіх ратацый. Упершыню завод арганізуе ў сябе вытворчасць 2-х абаротных плоскадрукарскіх машын.

У калгаснай брыгадзе вырашаецца поспех падрыхтоўкі і правядзення веснавой сяўбы

БРЫГАДА АБЯЗЛІЧАНА

У брыгадзіра КОЛІКАВА з калгаса «Звязда» (Копыскі сельсавет, Аршаншчына) — дружная, моцна складзеная, добра дысцыплінаваная брыгада. З ёю ён перамог на ўсіх палявых работах. Колікаў добра засеяў і беражна ўбраў.

Колікаў добра ведае сваіх людзей. За два гады брыгадзірства ён азнаёміўся з кожным калгаснікам, вывучыў апольнасці кожнага.

У самой брыгадзе, склад якой не мяняўся на працяту двух год і якая ўвесь час працуе на замацаваных за ёю участках, укаранілася сапраўдныя соцыялістычныя формы працы — ударніцтва і спаборніцтва.

У спаборніцтве з другой брыгадай (брыгадзір Трузаў) Колікаў заваяваў пярэшнінства. Брыгада Колікава перавыканала заданне па ўраджайнасці і сабрала на 170 цэнтн. збожжа больш, чым брыгада Трузава. Глебавыя ўмовы на ўчастках абодвух брыгад адполькавыя, таксама як і ўровні вытворчасці.

Гэта было ўлічана праўленнем калгаса ў канцы с.-г. года пры размеркаванні даходаў. Брыгадзе Колікава за перавыкананне задання па павышэнню ўраджайнасці праўленнем калгаса «Звязда» было прыбаўлена 3 проц. працадзён, а брыгадзе Трузава колькасць працадзён была зменшана на 3 проц.

Пасля выканання сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай і стварэння дастатковых кармовых фондаў для коней і кароў у калгасе «Звязда» на кожны працадзень прыпалося 3,5 кгр. збожжавых, 8 кгр. бульбы, 5 кгр. капусты і 45 кап. грашыма.

У поспехах калгаса «Звязда» рашаючую ролю альграла пастаянная, правільна арганізаваная вытворчая брыгада і добры падбор брыгадзіраў з лепшых угарнікаў-калгаснікаў, авладаўшых тэхнікай буйнай сельска гаспадарчай вытворчасці.

У калгасе «Звязда» брыгадзіры не толькі забяспечылі правільную расстаноўку сіл і поўнае скарыстанне сродкаў вытворчасці, улік колькасных і якасных паказальнікаў работы брыгадных звеньняў, але і асабістым удзелам у рабоце на полі за палявалі вытворчы энтузіязм калгаснікаў. Характэрна, што брыгадзіры за арганізацыю працы ў брыгадзе атрымліваюць усяго 0,25 працэнта. Напрыклад, брыгадзір Колікаў 380 працадзён выпрацаваў непасрэдна на фізічнай рабоце.

І зараз зімовыя дні ў брыгадзе Колікава насычаны вялікімі вытворчымі справамі, каб загадзя скончыць падрыхтоўку да сяўбы, каб вясной не была патрачана дарэмна ні адна гадзіна. Брыгада ўзяла пад свой непасрэдны кантроль усе звёны перадвеснавой падрыхтоўкі, пачынаючы ад рамонта збруі, інвентара, вызвазкі гною і канчаючы доглядам за цягавай сілай. Ні адна дробязь не выходзіць з поля зроку брыгадзіраў.

Той факт, што брыгада Колікава ўжо зараз абмяркоўвае, якую культуру, на якім участку сеяць, колькі вывезці гною на тое або іншае поле, гаворыць за тое, што ў 1934 годзе калгас «Звязда» даб'ецца яшчэ большых поспехаў.

На прыкладзе калгаса «Звязда» мы бачым, якую велізарную ролю адыгрывае пастаянная вытворчая калгасная брыгада ў барацьбе за ўзнёсшае ўраджайнасці і паспяховую падрыхтоўку да другой большэвіцкай вясны.

Перад «фронтам» прайшлася праверачная камісія. На першы погляд усё ў парадку: плугі адрамантаваны, змазаны, хамуты на лямцах, добра дапасаваныя, супоі, лейцы, пастронкі новыя, моцныя... Аднак камісія гэтым уражаннем не задавальняецца: пільна правяраецца кожная деталь.

— Што гэта ў цябе, Цюнісаў, лейны да зямлі павісалі, чаму не ў кольцах?..

Гэта ў 3-й брыгадзе. Цюнісаў не ведае, куды дзець вочы, брыгадзір Бакшанскі чырванее і нешта невыразна мармоча... У астатніх двух брыгадах калгаснікі кінуліся правяраць дапасаванасць лейцаў...

Камісія падыйшла да брыгады № 2. Тут таксама ўсё ў парадку. Толькі:

— Ільюшэнка! Што гэта ты зрабіў? Чаму гэта ў цябе бораны быццам бы пасварыліся паміж сабой... Яны-ж не парныя!

— Гэта ён з прасоння, спяшаўся...

У першай брыгадзе на чале з тав. Заленскім (кандыдат партыі) не было выяўлена ні аднаго дэфекта. Заленскі абвясціў сваю брыгаду ўдарнай імя Семнаццатага.

Коні не ў дрэнным становішчы, але каб яны змаглі без усякіх перабояў працаваць вясной, трэба яшчэ больш узмацніць догляд за імі.

Пасля праверкі коняй і інвентара камісія пашла ў свірны. Там кладаўшчык Мальковіч пахваліўся засекамі адсартаванага, сухога на сёння. Толькі шаніца аказалася крыху сырватай, але яе Мальковіч пасыпаў тонкім пластом і амаль кожны дзень перамешвае.

Калёсы таксама поўнасцю і добра адрамантаваны.

Калі камісія падагульвала вынікі пробнага выезда, калгаснікі парашылі

Не заспакойвацца на дасягнутым, падцягваць падрыхтоўку да вясны, каб у 1934 годзе дабіцца па збожжы не менш 10 цэнтнераў з га, па бульбе—130 ц., а сярэдні гадавы ўдой з каровы каб быў не ніжэй 1300 літраў.

Разышліся ўпэўненымі ў свае сілы, у тое, што пад кіраўніцтвам палітаддзела можна не толькі добра правесці пробны, але і ўсю вес навую сяўбу.

ВІТ. ДАЛЬ.

Брыгады распусцілі... да вясны

БАБРУЙСК (нап. кар.).

Вясной 1933 г. у калгасе «Колас», Восаўскага сельсовета, былі арганізаваны дзве палявыя вытворчыя брыгады. Аграном райза тав. Парфенаў распрацаваў і з дапамогай землеўпаралчыка ўстанавіў на палях калгаса «Колас» сямёпольны севазварот. Кожная з двух брыгад атрымала свой участак па 22,5 га ў кожным полі.

Першая брыгада Хадасевіча Рытора выклікала на соцпаборніцтва другую брыгаду, на чале якой стаяў брыгадзір Хадасевіч Цімох.

Спаборнічаючы на лепшае правядзенне палявых работ, першая брыгада ўвесь час працавала лепш за другую і ў рэзультаце ўчасткі першай брыгады далі ўраджай на 10-16 проц. вышэй, чым у другой брыгадзе.

Згодна пастановы ЦК і СНК першая брыгада павінна была праз ад паведную надбаўку працадзён атрымаць больш прадукцыі.

Аднак, праўленне калгаса (старшыня Шавель) рашыла ніякіх накідак і скідак не рабіць. Абедзве брыгады пры размеркаванні даходаў атрымалі афіцыяльна пароўну, а фактычна папярэдняя першая ўдарная брыгада, а выйграла горшая другая брыгада.

Кулацкая ўраўнілаўка пры размеркаванні даходаў давала да падзення працоўнай дысцыпліны, да абязлічкі ў падрыхтоўцы да пасеўнай кампаніі 1934 г.

Мала гэтага, у калгасе «Колас» парашылі на зіму... зусім распусціць брыгады і зноў іх арганізаваць з выхадам у поле. Пасля гэтага зразумела, чаму ў «Коласе» падрыхтоўка да сяўбы злачынна зрываецца.

Насенне ў калгасе ёсць у дастатковай колькасці. Але якое? Толькі адзін авёс гатунковы, усё астатняе насенне ад ячменю да ільну— самага горшага гатунку. Яго абавязкова трэба абмяняць на гатунковае. Гэта не ўключана ў план работы калгаса. Падругое, ячмень, пшаніцу патрэбна адсартаваць на трыеры, а калгас думае абмежавацца тым, што прапусціць гэта насенне праз «трыумф», што пярэчыць патрабаванню сеяць высокагатунковым і поўнавагім зернем.

Інвентар. Калі плугі і бораны адрамантаваны, то за прывядзенне ў парадак калёс пакуль што калгасная кузня не бралася і не збіраецца браць. А між тым, гэта самы складаны і буйны рамонт. Таксама забыт рамонт касілак, жнівярак. Не гледзячы на тое, што да ўборкі яшчэ далёка — рамантаваць уборачны інвентар патрэбна зараз, хоцьбы толькі па тых меркаваннях, што зімой больш вольнага часу.

Не хапае 10 тамутоў, пастромкаў, лейцаў, супоняй і інш. «дробязяй».

Калі-б сёння трэба было выяжджаць на палявыя работы, то аказалася-б, што 9 з 50 коняй непрыгодны для палявых работ, бо яны слабасільныя і патрабуюць узмоцненага догляду і падкормкі. Сёлета, калі ў калгасе хапае кармоў, такія адносіны да цягавай сілы асабліва нецярпімы.

Трэба сказаць, што ўсе гэтыя згід насці маюць месца не толькі ў адным «Коласе». Ні адзін калгас у раёне не зрабіў накідак правядзёнцам лепшым брыгадам і скідак горшым. Райза не можа назваць ні аднаго калгаса, дзе-б падрыхтоўка да вясны канцэнтравалася непасрэдна ў брыгадзе. Брыгада з наступленнем зімы забыта. Палітычная бліндаружасць раённых арганізацый дайшла да таго, што яны не бачаць у гэтым інтаравані брыгады нічога ненармальнага. Ці варта даказваць, што гэта становішча падрывае падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі.

Інтарэсы веснавой сяўбы патрабуюць неадкладнага змяшчэння адносін па брыгады. Бабруйскія арганізацыі павінны, нарэшце, зразумець, што поспех веснавой сяўбы і якасць падрыхтоўкі да палявых работ вырашаецца ў брыгадзе і іменна зараз.

П. Чыкун.



ПРОБНЫ ВЫЕЗД — ПРАВЕРКА ГАТОЎНАСЦІ ДА СЯЎБЫ

Калгас «Іскра», Каменскага раёна (Сярэдняя Волга) закончыў падрыхтоўку да пасеўнай і наладзіў агляд гатоўнасці да сяўбы.

ПАДРЫХТОЎКУ ДА СЯЎБЫ—ПАД КАНТРОЛЬ ІНСПЕКЦЫІ ЯКАСЦІ

Інспекцыя якасці — новая справа ў калгасе. Таму, як выбралі нас інспектарамі, мы не ведалі, з чаго пачаць работу. Калгаснікі да нас адносіліся насмешліва: «як гэта та кія-ж самыя гаспадары, як і яны, будуць правяраць іх работу». Калі пачаліся палявыя работы, для нас стала ясным, чым займацца.

Мы правяралі якасць ворыва і баранавання, калі дрэнна было зроблена, прымушалі перарабляць. У 2-й брыгадзе, напрыклад, было перабаранавана 4 га, у 3-й — 0,6 га. Мы выяўлялі абсевы, у другой брыгадзе было выяўлена 0,15 га, у трэцяй — 0,5 га. Мы правяралі якасць праполкі. Выявілася, што трэцяя брыгада лён і бульбу прапалола дрэнна. Мы сачылі за якасцю ўборкі, і асабліва — як брыгады ўкладаліся ва ўстаноўленыя тэрміны ўборкі. Дзе ўборка была зроблена дрэнна, мы прымушалі людзей перарабляць. Да нас палепшыліся адносіны, і інспекцыю якасці пачалі паважаць.

Усё гэта нам вельмі спатрэбілася, калі калгас прыступіў да канчатковага размеркавання ўраджаю. Мы-ж прыступілі да адзінкі гадавой работы вытворчых паляводчых брыгад.

У нашым калгасе тры паляводчыя брыгады. Першым паказальнікам пры ацэнцы іх работы мы ўзялі ўраджайнасць. Для 1-й брыгады ўраджайнасць бульбы з аднаго га была ўстаноўлена ў 120 цэнтнераў. Фактычна яна дала 132,9 цэнтнера, або 110,2 проц. Для 2-й брыгады ўраджайнасць была ўстаноўлена ў 119 цэнтнераў, дала-ж яна 118,2 цэнтнера, або 99 проц., і трэцяя брыгада павінна была даць 120,5 цэнтнера, дала-ж 116 цэнтнераў, або 96,2 проц. Па аўсу атрымаліся такія паказальнікі: у першай брыгадзе пры плане ў 12 з паловай цэнтнераў выканане на 119 проц., другой — 12 з паловай цэнтнераў, выканане на 96 проц., у трэцяй — 11 з паловай цэнтнераў, выканана на 107. На ячменю план першай брыгады — у 12 цэнтнераў — выканан на 90 проц., у другой — 8,6 цэнтнераў—на 94,5 проц. і трэцяй — 11 цэнтнераў — выкананне плана на 99 проц. Гэтак-жа сама мы правералі і ўраджайнасць па астатніх культурах.

Другім паказальнікам мы ўзялі — як брыгады ўкладаліся ў тэрміны веснавой сяўбы і якасць яе.

Уборка жыта па ўсіх брыгадах прайшла ва ўстаноўлены тэрмін — за 6 дзён. Таксама ўсе астатнія культуры былі ўораны ва ўстаноўленыя тэрміны. Але па якасці ўборка прайшла па першай брыгадзе — добра, па другой — дрэнна і па трэцяй — здавальняюча.

Потым мы ўлічылі яшчэ, як брыгады выканалі перад дзяржавай пастаўкі ўсіх культур. Па жыту ўсе брыгады выканалі пастаўкі да ўстаноўленага тэрміна — 10 жніўня. Па ячменю першая і трэцяя брыгады выканалі ў тэрмін — 20 жніўня, другая — 23-га. Па бульбе апошні тэрмін быў 1 кастрычніка. Першая і другая брыгады выканалі, трэцяя спазнілася на 27 дзён.

Таксама мы ўлічылі і становішча цягавай сілы, і многія другія паказальнікі. Усяго вызначылі 8 балаў. Калі ўсё падагулялі, то атрымалася: у першай брыгадзе 5 балаў «добра», 3 — «здавальняюча», «дрэнна» — няма. У другой «добра» — няма, «здавальняюча»—3, дрэнна» — 5. І ў трэцяй «добра» — 2, «здавальняюча» — 5, «дрэнна» — 1.

Відома, што лепшая брыгада ў калгасе першая. Потым ідзе трэцяя і апошняй другая. У залежнасці ад гэтых паказальнікаў мы павялічылі агульную колькасць працадзён. Першай брыгадзе на 5 процантаў, трэцяй брыгадзе прадаўжнізілі на 2 проц., і другой на тры процанты.

Калі гэта мы выклалі на агульны сход калгаснікаў, вакол зробленай намі адзінкі работы брыгад разгарэлася класавая барацьба. У нас атрымалася так, як у вядомай байцы Крылова «Воз і муха».

Пакпіталі крылоўскай мухі, лодыры, прагульшчыкі і ўсе абібокі пачалі нагла заяўляць, што ўсе працавалі роўна ў калгасе, і ўраджай павінны дзяліць пароўну. Розными спосабамі ўсё гэта кулацкае ахвосце імкнулася працягнуць і размеркаванні ўраджаю кулацкую ўраўнілаўку. Чаго яны толькі не пускалі ў ход.

— Мы не вінаваты, — гаварыў лодыр Губчык Апанас, — што ў першай брыгады атрымаўся лепшы ўраджай. У яе зямля была лепшая.

— Не, вы вінаваты, — даказвалі ім з першай брыгады, і пачыналі ўспамінаць:

— Ці памятаеце вы, — зварачаліся яны да другой брыгады, — калі мы летам выходзілі ў выходны дзень на работу, вы нас называлі выскачкамі, а самі тулыліся па пляжах.

З вялікімі труднаснямі, ўсё-ж зроблена ацэнка работы брыгад была прынята агульным сходам калгаснікаў. Зараз ураджай па нашым калгасе ўжо канчаткова размеркаван. Лодыраў і ўсіх апітрафаваных з усіх брыгад у нас падраўнілі да горшай, другой брыгады. Лепшыя ўдарнікі горшых брыгад прэміраваны гоцшыма. Па адзін працадзень па нашым калгасе прыпадае 8 кіло бульбы, 3 кіло збожжавых і 4 кіло кармоў. Калгас нам забяспечыў кармамі свінаферму ў 160 галоў.

Інспекцыя якасці зберагла нямала цэнтнераў калгаснага ўраджая. Але, каб узяць у 1934 годзе яшчэ больш высокі ўраджай мы зараз уключыліся ў падрыхтоўку да веснавой сяўбы. Кожны ўчастак нам узят пад кантроль. Мы праверяем і якасць рамонта, і якасць ачысткі і сартыроўкі насення, якасць догляду за жывёлай, якасць падбора і расстаноўкі людзей.

Па вопыце мінулага года мы ўжо добра ведаем, што высокі ўраджай 1934 года будзе залежыць ад якасці падрыхтоўкі да вясны.

ІНСПЕКЦЫЯ ЯКАСЦІ КАЛГАСА «ЧЫРВОНАЯ ВЯСЕЯ», СЛУЦКАГА РАЁНА: ГАНЧАРЭВІЧ, КАРЦЕЛЬ САВА, СІНІЦА ХВЯДОРА, АЖЭУСКАЯ ГАННА, БАНДАРЭВІЧ АНТАНІНА і СІНІЦА.

УПЭЎНЕНЫЯ Ў ПЕРАМОЗЕ

Як і звычайна, на работу выйшлі пераважна зярокам студзеньскай раніцы. Калі сабраліся, старшыня калгаса тав. Качкоў абвясціў:

— Пры распрацоўцы тэзісаў да 17 партз'езда мы ўзялі на сябе шмат абавязацельстваў па падрыхтоўцы да вясны. Дык давайце-ж пабачым, як мы іх выканалі...

Сёння, ў нас будзе першы пробны выезд. Брыгадзіры, падрыхтуйце брыгады да выхаду ў поле... з плугамі, боранамі, сявяркамі...

Кожны калгаснік добра ведаў свае коні, плуг, барану, сваё месца ў брыгадзе. І таму літаральна праз 15 хвілін пасля абвяшчэння выезда на прасторным двары калгаса «Ларынаўка», Аршанскага раёна, выстраіліся па-брыгадна трыкалоны аратых, баронавалокаў, сяўцоў, гатовыя да боя за план чацвертай большэвіцкай вясны.

Перад «фронтам» прайшлася праверачная камісія. На першы погляд усё ў парадку: плугі адрамантаваны, змазаны, хамуты на лямцах, добра дапасаваныя, супоі, лейцы, пастронкі новыя, моцныя... Аднак камісія гэтым уражаннем не задавальняецца: пільна правяраецца кожная деталь.

— Што гэта ў цябе, Цюнісаў, лейны да зямлі павісалі, чаму не ў кольцах?..

Гэта ў 3-й брыгадзе. Цюнісаў не ведае, куды дзець вочы, брыгадзір Бакшанскі чырванее і нешта невыразна мармоча... У астатніх двух брыгадах калгаснікі кінуліся правяраць дапасаванасць лейцаў...

Камісія падыйшла да брыгады № 2. Тут таксама ўсё ў парадку. Толькі:

— Ільюшэнка! Што гэта ты зрабіў? Чаму гэта ў цябе бораны быццам бы пасварыліся паміж сабой... Яны-ж не парныя!

— Гэта ён з прасоння, спяшаўся...

У першай брыгадзе на чале з тав. Заленскім (кандыдат партыі) не было выяўлена ні аднаго дэфекта. Заленскі абвясціў сваю брыгаду ўдарнай імя Семнаццатага.

Коні не ў дрэнным становішчы, але каб яны змаглі без усякіх перабояў працаваць вясной, трэба яшчэ больш узмацніць догляд за імі.

Пасля праверкі коняй і інвентара камісія пашла ў свірны. Там кладаўшчык Мальковіч пахваліўся засекамі адсартаванага, сухога на сёння. Толькі шаніца аказалася крыху сырватай, але яе Мальковіч пасыпаў тонкім пластом і амаль кожны дзень перамешвае.

Калёсы таксама поўнасцю і добра адрамантаваны.

Калі камісія падагульвала вынікі пробнага выезда, калгаснікі парашылі

Не заспакойвацца на дасягнутым, падцягваць падрыхтоўку да вясны, каб у 1934 годзе дабіцца па збожжы не менш 10 цэнтнераў з га, па бульбе—130 ц., а сярэдні гадавы ўдой з каровы каб быў не ніжэй 1300 літраў.

Разышліся ўпэўненымі ў свае сілы, у тое, што пад кіраўніцтвам палітаддзела можна не толькі добра правесці пробны, але і ўсю веснавую сяўбу.

ВІТ. ДАЛЬ.

ГРЫНГЛАЗ, БЕЛКІН

Рашучэ пакончыць з ігнаравакнем агратэхнікі

Паварот усёй партыі да дэталяў калгаснага жыцця, калгаснай вытворчасці, стварэнне палітаддзелаў, закон аб абавязковых мінімумах, лозунг аб калгаснай заможнасці — вось тыя вехі, па якіх ішла барацьба за ажыццяўленне ўказанняў правадыра нашай партыі тав. **СТАЛІНА** аб новых метадах кіраўніцтва сельскай гаспадаркай.

Велізарнейшыя перамогі калгаснага ладу, дасягнутыя ў першым годзе другой пяцігодкі, з'яўляюцца прамым рэзультатам канкрэтнага кіраўніцтва нашай партыі сельскай гаспадаркай, арганізацыі і ўзначальвання актыўнасці калгасных мас у барацьбе за большэвіцкія калгасы і заможных калгаснікаў.

На прыёме дэлегацыі калгаснікаў Днепрапятроўскай вобласці тав. **Сталін**, адзначаючы дасягненні калгасаў, указаў, што гэта толькі першыя кроны, пазат 10-12 кгр. на працадзень яшчэ мала, трэба больш і будзе ў калгаснікаў многа больш, калі яны чэсна будуць працаваць у калгасе.

Баявая падрыхтоўка да вясны — вось што вырашае перамогу высокіх ураджаяў будучага года. Гэта перамога вырашаецца зараз літаральна на сёння.

— Аўладанне тэхнікай сельскагаспадарчай вытворчасці, аўладанне агратэхнікай з'яўляецца адной з баявых задач у справе падрыхтоўкі веснавой пасеўнай кампаніі 1934 года, адной з рашаючых умоў павышэння ўраджайнасці.

Отрад калгасных мас эрат аглядаецца вялікая цята да аўладання навукай і тэхнікай вядзення сельскай гаспадаркі.

Калгасы — імя **Сталіна, «Барацьба»** і **«Перамога»**, Пярэжырскага сельсавета, Пухавіцкага раёна, ужо ў мінулым годзе на аснове прымянення агратэхнікі дабіліся значнага павышэння ўраджайнасці сваіх палёў. Калгас «Барацьба» замест леташніх 8,5 цэнтн. жыта з гектара узяў сёлета ў сярэднім 12 цэнтн., а дзе-ні-дзе і 15. Невымяральна павялічылася ўраджайнасць бульбы. Калгас у сярэднім сабраў па 750 пудоў з гектара. Вось чаму ў гэтым калгасе ў параўнанні з мінулым годам вага працадня падвоілася — замест леташніх 2,6 кгр. зярна на працадзень, сёлета калгаснікі атрымалі 5 кгр.

Гэтыя калгасы, уключыўшыся ў вытворчы паход імя XVII з'езда ВКП(б)Б і XV з'езда КП(б)Б, паставілі перад сабой задачу — пераламаць у адносінах да калгаснай пашы, энергію і энтузіязм калгасных мас памножыць на асваенне агратэхнікі. У калгасах шырока разгарнулася агратэхвучоба.

Расце і мацнее вопытніцтва на калгасных палях. Даволі адзначыць вопыты калгаснікі-ўдарніка **Быкава**, калгаса імя **Молатава**, Смалявіцкага раёна, і брыгадзіра **Копэца**, з калгаса «Першы май», таго-ж раёна. Тав. Быкаў правядзённем раду вопытаў з прымяненнем розных угнаенняў сабраў 1.100 пудоў бульбы з гектара.

Аб велізарнейшых магчымасцях, якія мы маем для ўдыму ўраджайнасці бульбы, сведчаць вопытныя ўчасткі **менскай бульбянай станцыі**. У калгасе імя Максіма Горкага, Жлобінскага раёна, дзякуючы ўжыванню фосфарнакалійнаазотных угнаенняў ураджайнасць бульбы павялічылася на 217 проц. Калгас зняў з кожнага гектара 1.056 пудоў.

У соўгасе **Судкова**, Хойніцкага раёна, пры прымяненні на угнаенне толькі аднаго попелу ўраджайнасць бульбы павялічылася на 198 проц. і дала 1.081 пудоў з гектара.

Звышранняя сяўба, у прыватнасці ільну, ужо ў гэтым годзе дала тысячы дадатковых цэнтнераў высокажакаснай ільнапрадукцыі. Дасяткі перадавых калгасаў **Полаччыны і Дрысеншчыны** звышранняй сяўбой ільну, прымяненнем праверэнных агрэмерапрыемстваў дабіліся павышэння ўраджайнасці сваіх палёў. Калгас «Барацьба» замест леташніх 8,5 цэнтн. жыта з гектара узяў сёлета ў сярэднім 12 цэнтн., а дзе-ні-дзе і 15. Невымяральна павялічылася ўраджайнасць бульбы. Калгас у сярэднім сабраў па 750 пудоў з гектара. Вось чаму ў гэтым калгасе ў параўнанні з мінулым годам вага працадня падвоілася — замест леташніх 2,6 кгр. зярна на працадзень, сёлета калгаснікі атрымалі 5 кгр.

Гэтыя калгасы, уключыўшыся ў вытворчы паход імя XVII з'езда ВКП(б)Б і XV з'езда КП(б)Б, паставілі перад сабой задачу — пераламаць у адносінах да калгаснай пашы, энергію і энтузіязм калгасных мас памножыць на асваенне агратэхнікі. У калгасах шырока разгарнулася агратэхвучоба.

Расце і мацнее вопытніцтва на калгасных палях. Даволі адзначыць вопыты калгаснікі-ўдарніка **Быкава**, калгаса імя **Молатава**, Смалявіцкага раёна, і брыгадзіра **Копэца**, з калгаса «Першы май», таго-ж раёна. Тав. Быкаў правядзённем раду вопытаў з прымяненнем розных угнаенняў сабраў 1.100 пудоў бульбы з гектара.

Аб велізарнейшых магчымасцях, якія мы маем для ўдыму ўраджайнасці бульбы, сведчаць вопытныя ўчасткі **менскай бульбянай станцыі**. У калгасе імя Максіма Горкага, Жлобінскага раёна, дзякуючы ўжыванню фосфарнакалійнаазотных угнаенняў

Супраліўленне звышранняй сяўбе і правядзенню раду іншых агратэхнічных мерапрыемстваў, якое аказалі вясной 1933 года ў радзе месц кулацкія недабіткі, гаворыць аб тым, што могія цэнтральныя і раённыя арганізацыі вельмі дрэнна кіруюць справай барацьбы за аўладанне агратэхнікай і ўкараненне не ў калгасную вытворчасць.

У мінулым годзе па БССР у звышранніх тэрміны было засеяна 7.300 га, у тым ліку 3.354 га аўса, 1.725 га ячменю, 1.560 га ільну і 661 га пшаніцы.

Усім вядома, што звышранняя сяўба значна павышае ўраджайнасць. Зусім правільна зрабіў Наркамзем, калі на гэты год запрактаваў засеяць у звышранніх тэрміны каля 35.000 гектараў — у пяць раз больш, чым летась. Але мала запрактаваць і спусціць лічбы ў раёны.

Для таго каб звышранняя сяўба дала максімальны эфект, неабходна на вопыце мінулага года выпрацаваць дакладныя аграправілы звышранняй сяўбы для асобных культур, выходзячы з канкрэтных умоў БССР.

Але бяда ў тым, што гэты багацейшы вопыт мінулага года і па сённяшні дзень яшчэ не вывучан. Наркамзем абмежаваўся тым, што адпусціў Акадэміі навук для гэтай мэты 10.000 рублёў. А Акадэмія вылучыла для вывучэння гэтай справы спецыяльную брыгаду з даволі аўтарытэтных навуковых работнікаў з акадэмікам **Домбалем** на чале. На жаль гэта брыгада за поўтода работы яшчэ не здолела распрацаваць і прадставіць неабходны матэрыял. Наркамзем, спасылаючыся на Акадэмію навук, бесапаможна разводзіць рукамі і літаральна нічога не робіць, каб своечасова выдаць аграправілы звышранняй сяўбы, якія-б грунтаваліся на вопыце мінулага года.

Канкрэтнае вывучэнне ўласцівасцяй розных глеб, правільнае ўжыванне ўгнаенняў, тарфаванне і вапнаванне глебы мае рашаючае значэнне не для ўдыму ўраджайнасці. Для кіраўніцтва гэтай справай некалькі год таму назад у БССР у раёнах быў спецыяльны штат аграхімікаў з агралабараторыямі.

Каб перашкодзіць удыму ўраджайнасці соцыялістычных палёў, паследышы Прышчэпава—Масюкоўны ліквідавалі і разагналі горшым. Ва ват у мінулым годзе план вапнавання па БССР выканан усяго на 37 проц., а тарфавання — яшчэ менш —на 16 проц.

Гэты адказнейшы ўчастак агратэхнікі так і астаўся без усякага навуковага і практычнага кіраўніцтва не толькі ў раёнах, але і ў наркамземе. Аб гэтым сведчыць хоцьбы той факт, што Наркамзем дагэтуль яшчэ не мае зацверджаных планаў вапнавання і тарфавання глебы на 1934 год. Раёнам ніякіх указанняў не даецца. Гэта справа зноў пушчана на самацёк.

Ушырокім паходзе калгасаў за атрыманне ў гэтым годзе ўраджаю і даходу на працадзень яшчэ большага чым летась барацьба за высокую якасць насенных фондаў з'яўляецца адным з важнейшых перадвясновых мерапрыемстваў. Асаблівую ўвагу трэба аддаць пытанням арганізацыі гатункавасмену. 15 студзеня скончыўся вызначаны ўрадам тэрмін для завяршэння гатунка абмену яравых культур. Між тым па БССР на 15 студзеня абменена 8.174 цэнт., замест вызначаных 21.722.

На гэтым участку выяўлены агіднейшыя факты ашукання дзяржавы. У радзе месц кіраўнікі калгасаў, МТС і земорганы, супакоеныя ўрачыстымі рапартамі аб завяршэнні засыпкі насенных фондаў, падшылі гэтыя рапарты «да справы», праставілі адпаведныя лічбы ў зводках і палічылі на гэтым свае абавязкі вычарпанымі. Класавая пільнасць на гэтым участку знізілася. Гэта прывяло к таму, што астаткі кулацтва і розныя антыкалгасныя элементы скарысталі аслабленне кіраўніцтва, для таго каб сарваць барацьбу за забеспячэнне веснавой сяўбы высокаякасным насеннем.

У Быхаўскім раёне, напрыклад, радавое насенне абмянялі на... ралавое. Чыстагатункавае насенне, адпраўлена з Слуцка ў Чэвусы, пры праверцы на ўсхожасць аказалася зусім нягодным для пасеву. У насенаводчым соўгасе «Пролетарый», Тэрэхаўскага раёна, пагнаілі сотні пудоў чыстагатункавага аўса.

На базах насенаводсаюза (Менск, Слуцк і інш.) хаванне насеннага матэрыяла пастаўлена настолькі дрэнна, што ўсхожасць яго знізілася з кожным днём. І таму зусім невыпадкова, што 30 проц чыстагатункавага насеннага матэрыяла для сяўбы ўжо непрыгодна.

Самым забытым участкам у Наркамземе з'яўляецца агратэхпрапаганда. І тут школьніцкая спадчына Масюкоўшчыны яшчэ не ліквідавана. Даволі адзначыць, што адпушчаныя ўрадам БССР сродкі на аднаўленне ў раёнах разваленых Масюковым агрэкабінетаў, не скарыстаны. Большасць раённых арганізацый злачынна недаацэньвае значэння агрэкабінетаў для агратэхпрапаганды. Загадчык Слуцкага райземаддзела, напрыклад, лічыць, што яму агрэкабінет не патрэбен.

Значная колькасць закупленага для агрэкабінетаў абсталявання проста знішчаецца з-за адсутнасці памяшканняў для іх. Па прапанове Наркамзема адвесці памяшканні для раённага агрэкабінета ў Менску старшыня менскага гарсовета т. Каранеўскі па бюракратычнаму адпёсся да гэтай справы і адмовіў у прадстаўленні памяшкання. Гэта робіць старшыня сталічнага совета, які абавязан паказаць узоры барацьбы за высокі ўраджай. У Сенненскім раёне агрэбінет закрылі, а памяшканне яго забралі пад кватэру для загадчыка райземаддзела.

Пад кіраўніцтвам палітаддзелаў у калгасах арганізаваны тысячы агратэхгурткоў, дзе калгаснікі павышаюць свае агратэхнічныя веды. Але гэта справа таксама астаецца без усякага кіраўніцтва з боку Наркамзема. І невыпадкова, што ў калгасах, неабслугоўваемых МТС, работа агратэхгурткоў зрываецца.

Нельга сказаць, каб кіраўнікі Наркамзема не ведалі аб гэтым. Па кожнаму пытанню вам могуць прадставіць дзесяткі праектаў розных пастаноў, загадаў і т. д. Але пры гэтым забываюць асноўнае:

пара ўжо «перайсці ад «агульнага» і адпагненага кіраўніцтва да канкрэтнага кіраўніцтва, ад «агульных» рэзалюцый да эператыўных рашэнняў, абгрунтаваных на вывучэнні і веданні дэталяў і тэхніцы справы, да цеснай жывой сувязі з нізавымі звяннямі вытворчасці і кіраўніцтва» (тэзісы даклада тав. Калгановіча).

Рост актыўнасці калгасных мас у барацьбе за высокі ўраджай стварае ўсе магчымасці шырока ўкараніць агратэхніку ў калгасную вытворчасць з тым, каб не адстаць ад новых патрабаванняў, ад новых задач далейшага павышэння ўраджайнасці. Але цяперашнія метады кіраўніцтва гэтым адказнейшым участкам з боку райземаддзелаў і Наркамзема з'яўляюцца сур'ёзнай перашкодай на шляху выканання пастаўленых перад намі партыяй задач у справе ўздыму ўраджайнасці.

Узброіць самую буйную ў свеце сельскую гаспадарку самай перадавой агратэхнікай з'яўляецца рашаючай умовай у барацьбе за паспяховае правядзенне веснавой сяўбы, за яшчэ большы ўраджай у 1934 г.

АБ ЗБОРЫ НА ПАТРЭБЫ ЖЫЛЛЁВАГА І КУЛЬТУРНА-БЫТАВОГА БУДАЎНІЦТВА Ў ГАРАДАХ І СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ НА 1934 ГОД

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў СССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў Саюза ССР пастанаўляюць:

Устанавіць на 1934 год збор на патрэбы жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў гарадах, пасёлках гарадскога тыпу і сельскіх мясцовасцях на наступных падставах:

АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ.

Да ўплаты збору прыцягваюцца:

рабочыя і служачыя, саматужні і рамеснікі і іншыя грамадзяне, маючыя самастойныя крыніцы даходу;

гаспадаркі калгаснікаў;

аднаасобныя сялянскія гаспадаркі.

Вызваляюцца ад абкладання зборам рабочыя і служачыя, заработная плата якіх не перавышае ў мясцовасцях, аднесеных па спагнанні падаходнага падатку к першаму поясу—100 руб. у месяц, к другому поясу—90 руб. у месяц, к трэцяму поясу—80 руб. у месяц і к чацвертаму поясу—75 руб. у месяц.

Вызваляюцца ад абкладання зборам:

асобы, узнагароджаныя ордэнамі Саюза ССР або ганаровай рэвалюцыйнай зброяй, і героі працы;

ваеннаслужачыя кадравага, раённага і малодшага начальніцкага складу тэрміновай (бесперапыннай) ваеннай службы;

кадравыя і знаходзячыяся ў рэзерве РСЧА ваеннаслужачыя сярэдняга, старшага і вышэйшага начальніцкага складу;

асобы сярэдняга, старшага і вышэйшага начальніцкага складу, якія адлучаюцца ў доўгатэрміновым водпуску, у запасе і ў пераменным саставе тэратарыяльных часцей РСЧА, ў якасці штатных работнікаў арміяцкіх Асавіяхіма праводзяць ваенную падрыхтоўку працоўных;

ваеннаслужачыя радавога і начальніцкага складу, якія праходзяць сапраўдную ваенную службу ў пераменным саставе тэратарыяльных часцей ці па-завайсковым лагерам, ваеннаслужачыя радавога і начальніцкага складу, якія знаходзяцца ў доўгатэрміновым водпуску і ваеннаабавязаныя радавога і начальніцкага складу (запрыўзнікі і запасныя)—на час знаходжання іх у радах РСЧА пры прыцягненні на ўстаноўленыя для іх збораў або ў якасці інструктароў па правядзенню збораў;

асобы стрэлкога і адміністрацыйна-гаспадарчага складу ваенізаванай аховы і ваенізаванай пажарнай аховы прадпрыемстваў і арганізацый, малочных асабліва дзяржаўнае значэнне, асобы апаратаў суда і адміністратыўна-гаспадарчага складу рабоча-сялянскай міліцыі, а таксама асобы апаратаў суда і адміністратыўна-гаспадарчага складу папраўча-працоўных устаноў;

былыя чырвонагвардзейцы і чырвоныя партызаны.

Асобы, указаныя ў арт. 3, вызваляюцца ад абкладання зборам па затрымліваемай імі заработнай плаце ці утрыманню на службе ў РСЧА. Калі гэтыя асобы маюць, апрача зарплаты, іншыя даходы (як, напрыклад, ад літаратурнай і навуковай работы, чытанне лекцый, здачы ў найм пабудоў і г. д.), то па гэтых даходах яны падлягаюць абкладанню зборам на агульных падставах.

Гаспадаркі калгаснікаў, у склад якіх уваходзяць ваеннаслужачыя і інш. асобы, пералічаныя ў арт. 3, а таксама інваліды вайны і працы, аднесеныя да 1-й, 2-й і 3-й груп інваліднасці, карыстаюцца наступнымі льготамі:

а) гаспадарка поўнасцю вызваляецца ад збору, калі яна была вызвалена ад сельгаспадатку ў 1933 годзе;

б) у астатніх выпадках, гаспадарка карыстаецца скідкай, з вылічанага акладу збору ў размеры 20 проц., а пры адсутнасці ў гаспадарцы другіх, апрача пералічаных у арт. 3, працаздольных членаў гаспадаркі—у размеры 40 проц.

7. Уладаючыя пабудовамі, рабочыя і служачыя, а таксама тыя члены іх сем'яў якія не маюць самастойных крыніц даходу (апрача пабудоў), вызваляюцца ад абкладання зборам па гэтых пабудовах, калі яны не мелі ў 1933 годзе даходу ад здачы пабудоў у наём або калі гэты даход не перавысіў неабкладаемага мінімума, устаноўленага для данай мясцовасці па падаходнаму падатку.

Саўнаркомы саюзных і аўтаномных рэспублік і ў мясцовыя бюджэты: па РСФСР — 25 проц., па УССР — 75 проц., па БССР, ЗСФСР, ТуркССР, УзССР і ТаджССР — 100 проц.

Урады саюзных рэспублік могуць ва ўказаных межах устанаўляць ды ферэнцыраваныя адлічэнні ад збору ў дзяржаўныя і мясцовыя бюджэты.

II. АБКЛАДАННЕ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ

12. З рабочых і служачых збор спагнаняецца на працягу 12 месяцаў па іх заработку за месяц, паводле плацежу збору, у наступных памерах:

Размер месячнага заработку ў руб.	Размер месячнага плацежу збору ў проц. к заработку за месяц
Да 100 руб	1,0
Звыш 100 да 125 руб.	1,5
Звыш 125 да 200 руб.	2,0
Звыш 200 да 500 руб.	2,5
Звыш 500 руб.	3,0

13. Для рабочых і служачых, маючых на сваім утрыманні больш трох асоб, памер збору паніжаецца: пры чатырох утрымальцах — на 25 проц., пры пяці — на 30 проц. і пры шасці і больш утрымальцах—на 40 проц.

14. У склад месячнага заработку рабочых і служачых уключаюцца ўсе сумы атрыманага імі заработку ўсіх відаў; а іменна: асноўная заработная плата, выплата за звыштэрміновыя і здзельныя работы, пераплатныя надбаўкі, прэміі, выплочваемыя пры прэміяльна-заахвочвальнай аплаце працы і т. д.

15. Не падлягаюць уключэнню ў склад месячнага заработку рабочых і служачых:

аднаразовае узнагароджанне і прэміі, выплочваемыя з фондаў, створаных па палажэнню аб фондах прэміравання за дасягненні па выкананню і перавыкананню прамфінпла на, а таксама за вынаходкі, тэхнічныя ўдасканаленні і рацыяналізатарскія прапановы, зацверджанаму ЦВК і СНК СССР 13-га жніўня 1931 года (збор законаў СССР, 1931 г. № 52, арт. 339).

16. Пры работе рабочых і служачых па сумяшчэнню ў двух ці некалькіх прадпрыемствах, установах і арганізацыях збор вылічаецца і ўплочваецца па кожнаму месцу работы асобна. Пры гэтым неабкладаемы мінімум (арт. 2) прымяняецца толькі па месцы асноўнай работы.

17. Рабочыя і служачыя, маючыя побочныя даходы ад работы не па працоўнаму дагавору і ад іншых крыніц, апрача дапаможнай сельскай гаспадаркі (арт. 18), абкладаюцца зборам па гэтых даходах па адпаведнай катэгорыі (арт. 21) незалежна ад абкладання па заработнай плаце.

18. Рабочыя і служачыя, якія вядуць сельскую гаспадарку на прысядзібнай зямлі і маюць адну карову, дробную жывёлу, пчол, сенакосы і агарод, але не маюць палявой зямлі і рабочай жывёлы, калі заработная плата з'яўляецца асноўнай крыніцай іх даходу, не абкладаюцца зборам па даходах ад сельскай гаспадаркі.

19. Збор з рабочых і служачых вылічваецца штомесячна прадпрыемствамі, установамі і арганізацыямі, у якіх яны працуюць, і ўтрымліваецца адзін раз у месяц пры выдачы заработнай платы.

20. На аднолькавых падставах з рабочымі і служачымі абкладаюцца зборам:

а) студэнты, якія атрымліваюць стыпендыю звыш 175 руб. у месяц і аспіранты;

б) асобы, атрымліваючыя даходы ад літаратурнай работы без заключэння аўтарскіх дагавораў;

в) каапераваныя саматужнікі і рамеснікі, працуючыя ў апушных майстэрнях;

г) каапераваныя саматужнікі і рамеснікі — члены вытворчых арцелей, працуючыя на даму — па заработку ад здачы прадукцыі ў арцель, членамі якой яны з'яўляюцца;

д) члены калегій абаронцаў па ўзнагароде, атрымліваемай ад кансультацыйных калектываў.

III. АБКЛАДАННЕ ІНШАГА НА СЕЛЬНІЦТВА, НЕЗАНЯТАГА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКАЙ

21. Грамадзяне, якія не маюць сельскай гаспадаркі, апрача рабочых, служачых і прыроўненых да іх асоб (арт. 20), падлягаюць для абкладання зборам па наступным трох катэгорыі:

I катэгорыя: грамадзяне, якія атрымліваюць даходы ад літаратурнай работы па аўтарскіх дагаворах, ад навуковай работы, ад заняткаў мастацтвамі, ад скарыстання аўтарскага права на свае творы; грамадзяне, якія атрымліваюць узнагароду за свае вынаходкі, па якія выданы аўтарскія пасведчанні, а так сама за тэхнічныя ўдасканаленні.

II катэгорыя: каапераваныя саматужнікі і рамеснікі, апрача прыроўненых да рабочых і служачых; некаапераваныя саматужнікі і рамеснікі, працуючыя без прымянення наёмнай працы; дактары, зубныя дактары, фельчары і т. д. — па даходах ад прыватнай практыкі; іншыя грамадзяне, якія атрымліваюць даходы ад работы не па працоўнаму дагавору, апрача аднесеных да катэгорыі 1-й; грамадзяне, якія атрымліваюць даходы ад здачы ў найм пабудоў, пакояў і т. д., калі яны па асноўных сваіх даходах не адносяцца да катэгорыі 1-й.

III катэгорыя: некаапераваныя саматужнікі і рамеснікі, эксплуатуючыя наёмную працу; асобы, якія займаюцца дробным гандлем; служыцелі рэлігійных культаў; іншыя грамадзяне, якія пражываюць на ад працоўныя даходы.

Платнікі ўказаных трох катэгорый уплочваюць збор па даходу, атрыманаму імі ў 1933 годзе, у наступных размерах:

Размер гадавога даходу у рублях	Размер збору ў процантах к гадавому даходу для платнікаў: I катэгорыі	II катэгорыі	III катэгорыі
Да 1.200	1,25	2,25	9,0
Звыш 1.200 да 1.500	1,75	2,75	11,0
Звыш 1.500 да 2.400	2,25	3,25	13,0
Звыш 2.400 да 4.200	2,75	4,0	16,0
Звыш 4.200 да 6.000	3,0	4,50	18,0
Звыш 6.000	3,25	6,0	24,0

22. Пры вызначэнні даходу платнікаў III катэгорыі даход ад крыніц існаваўшых напоўны 1933 год, дадаўшы да гадавога, а даход ад пабудоў вылічваецца ў размеры фактычна атрыманага даходу, але не ніжэй 35 проц. страхавойацэнкі па будоў.

23. Платнікі III катэгорыі, якія пражываюць у сельскіх мясцовасцях, і якія прыцягваліся ў 1933 г. да самаабкладання, уплочваюць збор не менш чым у падвойным памеры іх плацяжоў па самаабкладанню на 1933 г.

24. Грамадзяне, якія па крыніцах свайго даходу адносяцца да некалькіх катэгорый, абкладаюцца зборам па кожнай з гэтых катэгорый асобна.

25. Збор уплочваецца:

а) платнікамі 1-й і 2-й катэгорый, — роўнымі долямі ў тры тэрміны: к 15-му лютага, 15-му сакавіка і 15-му красавіка 1934 г.;

б) платнікамі III катэгорыі — роўнымі долямі ў 2 тэрміны: к 15-му лютага і 15-му сакавіка 1934 г.

IV. АБКЛАДАННЕ ГАСПАДАРАК КАЛГАСНІКАЎ І АДНААСОБНЫХ СЯЛЯНСКІХ ГАСПАДАРАК

26. Гаспадаркі калгаснікаў і аднаасобныя сялянскія гаспадаркі абкладаюцца зборам у наступных памерах:

КАТЭГОРЫІ ПЛАТНІКАЎ	Размер (стаўка) збору
I. Гаспадаркі калгаснікаў, апрача поўнасцю альбо часткова вызваленых ад збор ў парадку арт. 9	ад 15 да 80 руб.
II. Гаспадаркі працоўных аднаасобнікаў, вызваленыя ў 1933 г. ад сельгаспадатку . .	15 руб.
III. Гаспадаркі працоўных адпаасобнікаў, якія абкладаліся ў 1933 г. сельгаспадаткам у цвёрдых стаўках	ад 15 да 80 руб.
IV. Гаспадаркі працоўных адпаасобнікаў, якія абкладаліся ў 1933 г. сельгаспадаткам у прагрэсіўных стаўках	ад 75 да 175 проц. акладу сельгаспадатку за 1933 г., але не менш стаўкі, устаноўленай у данай мясцовасці для гаспадарак III катэгорыі.
V. Кулацкія гаспадаркі	200 проц. акладу сельгаспадатку за 1933 г.

27. Для гаспадарак калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, апрача ад названых да IV катэгорыі, маючых больш двух непрацаздольных членаў гаспадаркі, памер збору паніжаецца пры трох непрацаздольных на 20 проц., пры чатырох на 30 проц. і пры пяці і больш — на 40 проц.

28. Указаныя ў арт. 26 стаўкі збору для другой і пятай катэгорый гаспадарак прымяняюцца без змяненняў на ўсёй тэрыторыі Саюза ССР.

29. Для I, III і IV катэгорый гаспадарак соўнаркомы саюзных рэспублік устанаўляюць сярэднія стаўкі збору для аўтаномных рэспублік і краёў (абласцей), а там, дзе іх няма — для раёнаў.

Соўнаркомы аўтаномных рэспублік і краёвыя (абласныя) выканкомы ўстанаўляюць сярэднія стаўкі для раёнаў, якія ўваходзяць у склад рэспублік і краёў (абласцей).

30. Раённыя выканкомы, не выходячы за ўказаныя ў арт. 26 межы, устанаўляюць канчатковыя стаўкі збору для асобных паселішч, а ў паасобных выпадках і для асобных калгасаў. Гэтыя стаўкі павінны быць аднолькавымі для ўсіх гаспадарак данага паселішча ці данага калгаса.

31. Пры ўстанаўленні ставак па кожнай рэспубліцы краю (вобласці) і раёну, павінна астацца без змянення агульная сума збору для кожнай паасобнай катэгорыі гаспадарак (I, III і IV), выпанаўстая па сярэдніх стаўках, якія ўстаноўлены для рэспублікі, краю (вобласці) ці раёна ў цэлым.

32. Калгаснікі і працоўныя аднаасобнікі, якія маюць неземляробчыя даходы, якія абкладаліся ці падлягалі абкладанню сельгаспадаткам у 1933 г., асобнаму абкладанню па гэтых даходах у парадку арт. арт. 21-25 не прыцягваюцца.

33. Гаспадаркі працоўных аднаасобнікаў, уступіўшыя ў калгасы да першага тэрміну ўплаты збору, абкладаюцца, як гаспадаркі аднаасобнікаў па тых крыніцах даходу, з якімі яны ўвайшлі ў калгас і па тых, якія не былі апрамаджаны ў калгасе.

34 Гаспадаркі калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў уплочваюць збор роўнымі долямі ў два тэрміны: к 15 лютага і 15 сакавіка 1934 г.

Соўнаркомы саюзных рэспублік могуць змяняць гэтыя тэрміны для асобных мясцовасцей.

Кулацкія гаспадаркі уплочваюць збор поўнасцю к 15 лютага 1934 г. і пазбаўляюцца ад льгот, якімі яны ўжываюць пры абкладанні зборам не карыстаюцца.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
М. КАЛІНІН.

Старшыня Совета Народных Камісараў Саюза ССР
В. МОЛАТАЎ (СКРАБІН).

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта Саюза ССР
А. ЕНУКІДЗЕ.

Масква, Крэмль.
23-га студзеня 1934 г.

Акадэмік А. Н. Бах

Хімію—на службу соцыялізму

Хімічная навука ў Расіі была пераважна в нам з другіх краін. Навука гэта стала дзяцьмі шляхова развівацца, але на глебе чыноўніцкамонгольскага ладу насіла вельмі акадэмічны характар. Дзяцьмі указаць, што выдатныя рускія хімікі—Зінін, Зайцаў, Васнрэсенскі, Бутлераў, Бекетаў, Менделеў — былі ў ліку асноваположнікаў навуковай хіміі ў палове мінулага стагоддзя, калі ў нас хімічная прамысловасць амаль палкам адсутнічала.

Акадэмічны характар нашай хімічнай навукі мала змяніўся і ў апошняй чверці мінулага стагоддзя, калі ў нас стала насаджацца капіталістычная хімічная прамысловасць. З аднаго боку, гэта галіна была наогул незначнай у параўнанні з галінамі метала і тэкстыля. З другога боку, замежныя гаспадары прадпрыемстваў у Расіі, бусмерна імкнуліся не прыцягваць рускіх кваліфікаваных работнікаў на прадпрыемствы, каб не даць ім магчымасці асвоіць вытворчыя працэсы. Вядома, былі і выключэнні. Самым яркім з іх быў Д. І. Мендзелеў, сусветны тэарэтык, які аддаў многа сіл хімічнай прамысловасці.

Як агульнае правіла, совецкая ўлада атрымала ў спадчыну ад мінулага рэжыма абмежаваную ў абёме, але даволі высокая стаячую хімічную навуку, якую толькі таму нельга было параўнаць у адарванасці ад прамысловасці, што яна ніколі не была звязана з ёю.

Совецкая ўлада паставіла сабе за задачай рэарганізаваць навуковую работу так, каб яна стала дзейсным фактарам будаўніцтва новага жыцця. У кароткі час была створана сетка навукова-даследчых інстытутаў, якія разгарнулі работу, заняўшую нават па прызнанню ворагаў відное месца ў совецкай навуцы.

Бліжэйшая задача навукова-даследчай хімічнай работы павінна быць усямернае садзейнічанне развіцю хімічнай прамысловасці шляхам распрацоўкі новых спосабаў вытворчасці, удасканалення ўжо вядомых шляхам бесперапыннай, сістэматычнай рацыяналізацыі вытворчых хімічных працэсаў.

Не падлягае ніякаму сумненню, што ў сэнсе развіцця і ўвядзення хімічнай тэхнікі за апошнія гады ёсць і ў даследчых інстытутах, і ў гаспадарчых прадпрыемствах значныя дасягненні. Але сур'ёзны аналіз становішча паказвае, што дасягненні безумоўна маглі быць значна большымі, чым яны з'яўляюцца ў цяперашні час.

Усякі планавы прагрэс у вытворчасці атрымліваецца ў результаце ўзаемадзеяння двух фактаў: лабараторнага навукова-тэхнічнага даследвання і гаспадарчага прыстасавання яго. У ажыццяўленні свайго дасягнення даследчык таксама не можа абыйсціся без гаспадарніка, як гаспадарнік без даследчыка: паміж імі павінна існаваць цясная кааперацыя на прыцыпе раздзялення працы. Нярэдкія патрабаваць ад гаспадарніка, каб ён стаў і лабаратарным сталу, як нярэдкія патрабаваць ад даследчыка, каб ён, адрываючыся ад сваёй работы, выконваў усякія вузкагаспадарчыя функцыі, накшталт адабывання будаўнічых матэрыялаў, рабочай сілы і заводскага абсталявання.

А між тым у гэтых адносінах у нас сярод стаіць далёка не сусім добра. Значная частка навуковых работнікаў лічыць, што іх абавязкі ў адносінах прамысловасці заканчваюцца лабараторнае-прароблення работай. Даследчык павінен ісці рука ў руку з гаспадарнікам да тае моманту, калі гаспадарнік абвясціць, што ён больш не адчувае патрэбы ў яго тэхналагічнай дапамозе. Гэта адзвалася-б многім даследчыкам дзіўным патрабаваннем. Супроць такіх настрояў прышлося весці ўпартую барацьбу, і ў гэтым напрамку ўжо многае зроблена.

Зусім аналагічныя настроі нярэдка назіраюцца і ў гаспадарнікаў. Некаторыя гаспадарнікі лічаць, што ім павінны быць прадстаўлены поўнасцю распрацаваныя, праверэныя вытворчыя працэсы і тады яны палічаюць прымяніць іх ці не. А рас працоўка гаспадарнікам новых спосабаў і актыўны ўдзел сваім вытворчым вопытам у іх ажыццяўленні лічацца неабавязковымі.

Мэта соцыялістычнай вытворчасці — задавальненне патрэб працоўных; мэта соцыялістычнай навукі—максімальнае палягчэнне і скарачэнне працы рабочага, максімальнае павышэнне якасці прызначаных да яго спажывання прадуктаў. І калі планавы пачатак з'яўляецца адной з каранных асноў соцыялістычнай гаспадаркі, то перад соцыялістычнай навукай стаць вялікая задача—бесперапынна развіваць і асвятляць шляхі далейшага развіцця ўсяго комплекса прадукцыйных сіл краіны.

І тут зноў паўстае пытанне аб узаемаадносінах тэорыі і практыкі ў навуковых даследваннях. Неправільна адмяжоўваць тэарэтычную «чыстую» навуку ад практыкі і недаацэньваць тое значэнне, якое тэорыя мае для практыкі. Бо тэорыя, адарваная ад практыкі, пазбаўлена ўсякага рэальнага зместу, а практыка без тэарэтычнага абгрунтавання выраджаецца ў самы першабытны эмпірызм. Калі для высвятлення ці упарадкавання бягучых момантаў вытворчасці нярэдка патрабуецца паставіць даследванні тэарэтычнага парадку, то тым больш для рашэння дальнабойных перспектыўных пытанняў, звязаных з развіццём прадукцыйных сіл, сістэматычныя тэарэтычныя даследванні абсалютна неабходны.

Ясна, што для ажыццяўлення задач, якія стаяць у нас перад хімічнай навукай, яна павінна не толькі асвятляць і настроўваць тэарэтычнымі даследваннямі вытворчасць, але і разгортваць шырокую перспектыўную даследчую работу па хімічных пытаннях, якія выцякаюць з генеральнай лініі соцыялістычнага будаўніцтва.

У адпаведнасці з патрабаваннямі сучаснага моманту нашы навукова-даследчыя інстытуты раздзелены на дзве групы: галіновыя інстытуты, якія цесна звязаны з вытворчымі абъядзяннямі данай галіны і абслугоўваюць яе тэхнічнымі і абмежавана-тэарэтычнымі даследваннямі, і галоўныя інстытуты, якія захоўваюць сувязь з прамысловасцю, для якой яны выконваюць дагаворныя заданні больш агульнага парадку і разам з тым распрацоўваюць перспектыўныя навуковыя праблемы, вырашэнне якіх створае ўмовы для далейшага прагрэсу жыцця соцыялістычнага грамадства.

За 16 год існавання совецкай улады фізічная хімія зрабіла ў нашым Саюзе вялікія поспехі, якія паставілі яе на колькасці і якасці работ на чацвертае месца — пасля Германіі, Англіі і ПАЗША.

У нас у навукова-даследчым інстытуце фізічнай хіміі імя Карпова за апошнія гады вырасла цэлае пакаленне маладых таленавітых вучоных, якія працуюць зараз нароўні са старымі спецыялістамі над вырашэннем чарговых праблем хімі.

Перад кожным совецкім хімікам насуе і перад навуковай моладдзю ў прыватнасці зараз стаіць асноўная задача — садзейнічаць усямернаму развіццю хімічнай прамысловасці. Маладыя хімікі, распрацоўваючы ў лабараторных інстытутах тую ці іншую праблему, павінны перш за ўсё ўлічваць адставанне хімічнай прамысловасці, яе слабае абслугоўванне ўтнаеннямі сельскай гаспадаркі. Іменна таму зараз нам неабходна ўсю сваю работу будаваць так, каб у найкаротшы тэрмін поўнасцю задаволіць патрэбы хутка развіваючагася соцыялістычнага земляробства.

Праф. Ф. Я. Бахцееў

В. І. ЛЕНІН АБ ТОРФЕ

Толькі што паспелі адгрымець аматы Акцябрскага перавароту, перыўшата новую эру ў гісторыі чалавецтва, як ужо ў першых лічбах лістапада 1917 г. у Омскім ўжо азнаямлення са становішчам торфяной гаспадаркі, Уладзімір Ільіч прапанаваў неадкладна прыняць меры да таго, каб торфяная гаспадарка маладой рэспублікі атрымала належны аўтарытэт і адпаведную арганізацыйную форму.

У той час торфяная справа набыла выключнае значэнне для цэнтральнапрамысловага раёна, не кажучы ў гаспадарчых, але і ў палітычных адносінах: электрыфікацыя пралетарскіх і прамысловых цэнтраў базавалася на торфе.

У красавіку 1918 г. праводзіцца нарада, якая ўваходзіць у Саўнаркоме, з непасрэдным удзеле Уладзіміра Ільіча, палажэнне аб Галоўторфе—органе, спецыяльна ведаючым прамысловай торфаздабычай.

Штогод на пасяджэннях СПА і СНК перад пачаткам торфяных сезонаў, Уладзімір Ільіч уваходзіў у дэталёвы разгляд пытанняў, звязаных з найбольш пасляховым ходам торфяных работ.

30 мая 1921 г., на пасяджэнні СПА пад старшынствам Леніна, пастаноўлена было скласці асобную камісію з даручэннем ёй—распрацаваць меры для задавальнення Галоўторфа харчамі, з тым, каб работы па торфяных промыслах не маглі спыніцца».

Усе наступныя поспехі ў торфяной справе, агульнае развіццё яе, удасканаленне ў паасобных галінах торфяной прамысловасці цясней шым звязаны з імем Уладзіміра Ільіча. Яны абазначаны яго настойлівай жывой зацікаўленасці да самых дэталёвых пытанняў бягучага жыцця спецыяльнай торфяной справы. Механізацыя здабычы торфу на тэме «гідраторфу», яе вынаходлівасць і практычнае ажыццяўленне ў іх грандыёзных размерах, якія мы маем у 17 годзе Акцябрскай рэвалюцыі, праведзена пры непасрэдным і самым блізкім удзеле Уладзіміра Ільіча. Вось як успамінае аб гэтым сам вынаходца «гідраторфу» талановіты інжынер Р. Э. Класон, бліжэйшы сайўдзельнік Уладзіміра Ільіча па рэвалюцыйнай рабоце ў рабочых гуртках Пецербурга.

Праходзіць першы перыяд Акцябра. Пачынаецца нястрымнае імкнення да вырашэння цэлага раду важнейшых гаспадарчых пытанняў.

Вялікі Ленін даведваецца аб гідраторфе. Старыя знаёмыя сустрэліся. Палітычны геній і вялікі тэхнічны розум зразумелі адзін аднаго. Гідраторф прызнаецца вынаходствам першаступенна - дзяржаўнай важнасці, але вакол вынаходства Класона закіпела барацьба. На абарону гідраторфу ўзнімаўся самы моцны абаронца — Ленін.

У пісьмах да І. І. Радчэнко Уладзімір Ільіч не раз спыняўся на пытаннях гідраторфу: «Справа гідратофу, — піша Уладзімір Ільіч, — мае выключную важнасць для РСФСР».

«Тав. Радчэнко, не прыдзірайцеся да гідраторфу. Гэта справа зако нам прызнана малочай выключную важнасць. Закон гэты Галоўторф абавязан праводзіць не за страх, а за сумленне... Давайце дэталі абмяркоўваць... У нас у Расіі трэба стварыць асобны цэнтр, заказаць пеў шыя машыны для гідраторфу. Паставіць з гэтымі асобны цэнтр г. зн. асобнае прадпрыемства і яму даручыць на свайму рушыць наперад гэтую справу. Знайдзіце людзей для гэтага».

Жыццё адказала на паставленае Леніным пытанне. Людзі знайшліся. Справа рушылася. Задача механічнай экскавацыі тарфяных масіваў для вялікіх гаспадарак выраша на.

Калі-б Уладзімір Ільіч не прыняў такога гарачага, такога актыўнага ўдзелу ў яе ажыццяўленні, ніхто не рызыкнуў-бы па той шырокі размах, які быў патрэбны ў попытных работах гідраторфу, і мы не мелі-б дасягнутых результатаў, якія так патрэбны нам зараз у справе электрыфікацыі Саюза і ў рацыянальным выкарыстанні нашых невычарпальных тарфяных багаццяў...

Уладзімір Ільіч хацеў пагляцець гідраторф, але ніяк не мог знайсці часу, каб з'ездзіць на «Электрапередачу», і работа па здабычы торфу, знятая на кіно-істужку, была яму паказана ў Крэмлі. Классон і Уладзімір Ільіч сталі побач і глядзелі на палатно. У гэты вечар яны былі несумненна шчасл.вы, бо яны закладвалі фундамант новага света.

Пасля дэманстрацыі фільмы і гутаркі з Р. Э. Класонам Уладзімір Ільіч зрабіўся гарачым абаронцам гэтага, тады яшчэ зусім новага спосабу здабычы торфа, не вышаўшага са стадыі вопыта, і ўзяў яго пад сваю апеку, даўшы тым магчымасць распрацаваць яго і правесці ў тарфяную прамысловасць.

З перапіскі Леніна з Класонам відаць, як жыва і блізка прымаў ён да сэрца інтарэсы гідраторфу.

«Прашу вас паведаміце мне (тав. Смаляннінаву, калі мяне няма і калі няма часу) дакладную прапанову аб дапамозе гідраторфу... Глядзіце, не прапусціце 1922 год... Чаму вы не далі ў Германіі прэміі дзесяць-пяць дзесят тысяч золатам за вынаходства спосабу абязводжвання? Мы-ж да вашага ад'езда гаварылі аб гэтым... Ці таму, што не было грошай (трэба раней унесці ў США), ці таму, што на прэміі такога роду трэба вельмі шмат... Колькі... Ці па іншых прычынах. Ці нельга цяпер натрыяльна ў Германіі, Каладзе і Амерыцы абяцаць такія патрэбныя прэміі?» (з пісьма В. І. Леніна да Р. Э. Класона ад 5 чэрвеня 1921 года). І далей: «Тав. Классон, я баюся, што Вы, выбачайце за адкрытасць, не здолееце выкарыстаць на станову Соўнаркома аб гідраторфе. Каб выкарыстаць як належыць па станову Соўнаркома, трэба: 1) біяліта сна строга абскарджаць яго парушэнні, уважліва сочачы за выкананне і, зразумела, выбіраючы для аб скарджання першы выпадак, пазыходзячы пад правіла «радка ды метка». 2) Час ад часу зноў-такі пры трымліваючыся таго-ж правіла, пісаць мне... Калі вы мяне не падвядзеце, г. зн. калі напаміны і залытанні будуць строга дзелавыя, дык я ў дзве мінуты буду падпісваць такія напаміны і залытанні. З пажа данням быстрых і вялікіх поспехаў Вашаму вынаходству і з прывітаннем В. Ленін».

Карта электрыфікацыі РСФСР, якая дэманстравалася В. І. Леніным на VIII з'ездзе Совета, намячаючы контуры перабудовы краіны на новай соцыялістычнай аснове, змяшчала ў ліку асноўных аб'ектаў электра будаўніцтва цэлы рад тарфяных электрастанцый.

Пытанні выкарыстання агрэмадных тарфяных рэсурсаў краіны В. І. Ленін, які заўсёды вельмі цікавіўся праблемамі іх выкарыстання, непарыўна звязваў з пытаннямі электрыфікацыі.

У гэтых адносінах асаблівы інтарэс прадстаўляе спецыяльнае пісьмо В. І. Леніна аб торфе («Записки института Ленина» 1928 г. III, стар. 5), пасланае ім Г. М. Каржыжаноўскаму: «Глеб Максімільяновіч! Мяне вельмі зацікавіла ваша паведамленне аб торфе. Ці не напішыце артыкул аб гэтым у «Экономическую жизнь» і потым брашурнай, або ў журнал? Неабходна абмяркаваць пытанне ў друку. Вось, моў, запасы торфу — мільярды. Яго цеплавая каштоўнасць. Яго месцазнаходжанне пад Масквой. Маскоўская вобласць. Пад Пецерам — перакладней. Яго лёгкасць здабывання параўнальна з вугпем, сланцом і інш. Скарыстанне працы мясцовых рабочых і сялян (хаця-б на чатыры гадзіны ў суткі для пачатку). Вось, моў, база электрыфікацыі ў столькі-та раз пры цяперашніх электрычных станцыях. Вось быстрэйшая і вярнейшая база аднаўлення прамысловасці; арганізацыя працы па соцыялістычнаму (земляробства + прамысловасць), выход з апалавага крызіса (з знаёмім столькі-та мільёнаў кубаў лесу на транспарт). Дайце выкіні вашага да клада; прыкладзіце карту торфу; кароткія разлікі — сумарныя. Магчы маць пабудаваць тарфяныя машыны быстра і т. д. і т. д. Кароткая сутнасць эканамічнай праграмы. Не абходна зараз-же рушыць пытанне ў друк. Ваш Ленін».

Так шырока і глыбока ставіў В. І. Ленін пытанне аб торфе.

В. І. Ленін гарэў мыслю аб неабходнасці хутчэйшай механізацыі тарфяной справы, і гэта адлюстравалася ў яго прамове на VIII усерасійскім з'ездзе Совета 22-XII-1920 г. Па дакладу «Аб дзейнасці Совета Народных Камісараў» ён гаварыў: «... я павінен сказаць, што ў галіне апалу мы маем адзін з буйнейшых поспехаў у відзе гідраўлічнага спосабу здабывання торфу. Не трэба за бываць, што мы маем неабсяжныя багацці торфу. Але мы не можам іх скарыстаць таму, што мы не можам пасылаць людзей на катаржныя работы. Капіталістычны лад мог пасылаць людзей на катаржныя работы. Пры капіталістычнай дзяржаве людзі ішлі туды працаваць з-за голаду, а пры соцыялістычнай дзяржаве на гэтыя катаржныя работы мы пасылаць не можам, а добраахвотна ніхто не пойдзе. Капіталістычны лад усё рабіў для вярхоў. Ён аб нізах не клапаціўся.

Трэба ўсюды больш уводзіць машыны, пераходзіць да ўжывання ма шынай тэхнікі магчыма шырэй. Здабыванне торфу гідраўлічным спосабам, якое так паспяхова прасунута наперад ВСНГ адкрывае магчымасці здабывання апалу ў велізарнай колькасці і ўстараняе неабходнасць прыцягнення абучаных рабочых, бо пры такім спосабе могуць працаваць і не абучаныя рабочыя...»

Пры правільнай ацэнцы народна-гаспадарчага значэння тарфяной праблемы Уладзімір Ільіч клапаціўся і аб стварэнні шырокіх кадраў па тарфяной справе; 3-IV 1920 г. ён піша т. Луначарскаму—б. наркамасветы—у пісьме «Каб узняць торфаздабыван не, трэба шырока паставіць прапаганду — лістоўкі, брашуры, перасовачныя выстаўкі, кінематографічныя здымкі, выданне падручнікаў, увесці ў абавязковы прадмет у вышэйшых навучальных установах курс торфаздабывання; штогодна пасылаць экскурсіі за мяжу».

Сваёй кіпучай энергіяй і сваім прынцыпіальным крытычным розумам Уладзімір Ільіч забяспечыў тарфяной справе не толькі буйны аўтарытэт, але падвёў пад яе моцны фундамант і неабходную матэрыяльную базу.

Творчая Акцябрская рэволюцыя, генеяльным натхняльнікам якой з'яўляецца Уладзімір Ільіч, у корані змяніла становішча і значэнне тарфяной праблемы ў народнай гаспадарцы СССР. Калі да Акцябра 1917 года, у часе росквіту капіталізма ў Расіі, торфу здабывалася ўсімі відамі прамысловасці 1.080 тыс. тон, то к XVI гадавіне Акцябра, у перыяд пабудовы соцыялізма, гэта здабыча дасягнула 11.000 тыс. тон, г. зн. яна вырасла на 1000 проц.

План «ГОЭЛРО», які В. І. Ленін называў другой праграмай партыі, у частцы пабудовы магутных электрастанцый на базе торфу не толькі выкананы, але і перавыкананы.

Ажыццяўленне ленінскага плана электрыфікацыі адбывалася ва ўмовах абвостранай класавай барацьбы. Шкодніцкія арганізацыі навяроўвалі галоўны ўдар супроць цэнтралізаванага энергазабяспечання, прычым дзейнасць шкодніцкаў неабмяжоўвалася рамкамі прамога шкодніцтва ў форме затрымання і сабатажу будаўніцтва, затрымання каштоўных вына ходстваў і дывэрсійных актаў. Шкодніцкія ўстаноўкі хаваліся і пад маскай самых вучоных разважанняў і выкладак.

Але практыка выканання ленінскага плана электрыфікацыі, непасрэдная практыка соцыялістычнага будаўніцтва разнучым чынам разбурыла ўсе разлікі шкоднікаў. Калі і зараз часамі мы адчуваем недахват электраэнергіі, калі і зараз яшчэ маюць месца перабоі ў апаласнабжэнні, дык пэўная доля прычын павінна быць аднесена да вынікаў доўгагадовага шкодніцтва. Гэта ака лічнасць павінна быць улічана пры д

„ГОД ПОСПЕХАЎ СССР“

АМЕРЫКАНСКІ ЖУРНАЛ АБ СОВЕЦКІМ САЮЗЕ

НЬЮ-ЙОРК, (БЕЛТА). Журнал «Керрэнт гісторы» апублікаваў артыкул прафесара Ферніса пад назвай: «Год поспехаў СССР».

Фернію канстатуе, што становішча СССР выразна палепшылася. Запасы харчоў у СССР дасягнулі самых вялікіх памераў у гісторыі краіны. Але што найбольш важна — хлебазагатоўкі закончаны на 2½ месяцы раней, чым ва ўсе папярэднія гады. Есць моцныя прадпасылкі для другой пяцігодкі. Поспехі ўнутранай палітыкі — піша Фернісь, — даюць магчымасць кіраўнікам СССР з верай глядзець у будучыню.

Апошнія гады, — заяўляе аўтар, — былі сведкамі нечуваных пераменаў у галіне народнай асветы, культуры, будаўніцтва школ, ліквідацыі непісьменнасці, росту тыража газет і журналаў.

«1933 год быў годам бесперапынных дасягненняў совецкай дыпламатыі. СССР дасягнуў міру і бяспасныя ці на ўсіх участках знешняй палітыкі, за выключэннем Германіі і Далёкага Ўсходу».

ЛЕНІНСКІЯ ДНІ ЗА ГУБЯЖОМ

ПАРЫЖ, 24 студзеня. (БЕЛТА). Паводле паведамлення «Юманіте» на ўчорашнім комуністычным мітынгу, прысвечаным 10-годдзю смерці Леніна, прысутнічалі 8 тысяч рабочых. У зале былі развешаны лозунгі: «Няхай жыве геройная барацьба компартыі Германіі», «Усе пад спіч Леніна і Сталіна», «Няхай жыве СССР — адзіная краіна, якая не ведае крызісу і беспрацоўя». У прэзідыум мітынга выбран ЦК компартыі Францыі.

Дакладчык Марсель Капэн, які быў сустрэнут доўгай авацыяй, абрысаваў значэнне Леніна, як геніяльнага тэаратыка і практыка пролетарскай рэволюцыі і ўказаў, што партыя Леніна пад кіраўніцтвам Сталіна пасляхова будзе соцыялізм.

Андрэ Марці выкрыў у сваім выступленні адрадніцкую ролю германскай соцыял дэмакратыі, якая праклала шлях фашызму. Генеральны сакратар компартыі Торрэз вітаў Камінтэрн і тав. Сталіна, як кіраўніка Камінтэрна. Пры выходзе пасля мітынга на вуліцу паміж рабочымі і паліцыяй адбываліся сутычкі, 30 рабочых паранена.

✦ У дзень дзесяцігоддзя смерці Леніна яўрэйская секцыя соцыял-дэмакратычнага таварыства «Працоўная моладзь» у Рыге наладзіла вечар з дакладам аб развіцці рэволюцыйнага руху ў Расіі. У час перапынку частка моладзі заспявала рэволюцыйныя песні. Паліцыя выве ла пеўных з залы.

АРЫШТЫ КОМУНІСТАЎ У ГЕРМАНІІ

БЕРЛІН, 24 студзеня (БЕЛТА). Любецкай паліцыяй арыштавана 15 комуністаў, абвінавачваемых «у дзяржаўнай здрадзе». У Эйтыне любецкай паліцыяй раскрыта комуністычная група. Канфіскавана пішучая машынка, два капіравальных апараты і партрэт Леніна.

Лейпцыгскім судом прысуджаны да аднаго года і 9 месяцаў турмы Эрнст Бернд, да 9 месяцаў механік Лейв. Гэтыя комуністы абвінавачваліся ў тым, што ў красавіку мінулага года распаўсюджвалі комуністычныя лістоўкі сярод матросаў германскага лінейнага судна «Гесэн». Касельскім судом да турэмнага зняволення ад аднаго года да аднаго года 6-ці месяцаў прысуджаны 8 рабочых за тое, што яны арганізавалі комуністычную ячэйку.

ЗАМЕЖНАЯ ХРОНІКА

✦ Міністэрства фінансаў скасавала правілы, якія абмяжоўваюць імпарт совецкага лесу. Скасован таксама «антыдэмпінгавы» штраф на ўвоз совецкіх запалак.

Адначасова міністэрства фінансаў скасавала распараджэнне аб забароне ўвозу совецкага золата.

✦ Поўнамочны прадстаўнік СССР у Амерыцы т. ТРАЯНОЎСКІ зрабіў першы візіт дзяржаўнаму сакратару ХЭЛЛУ. Тав. Траяноўскі і Хэлл абмяняліся запэўненнямі ў дружбе.

✦ Як паведамляюць з Харбіна, 21-та студзеня ў чатырох харбінскіх чыгуначных клубах праведзены закрытыя жалобныя сходы совецкіх грамадзян, прысвечаныя 10-годдзю смерці Леніна. Залы дэкараваны лозунгамі «Без Леніна, але па ленінскаму шляху» і іншымі, а таксама партрэтамі Леніна і Сталіна. Выбранне т. Сталіна ў ганаровы прэзідыум было сустрэта бурнымі авацыямі. Такія-ж сходы праведзены па ўсёй лініі КУЧ.

✦ Аб'яднанае пасяджэнне генеральнага совета трэд'юніёнаў і нацыянальнага совета лейбарыстскай партыі прыняло рэзалюцыю з пратэстам супроць таго, што Дзімітрава, Торглера, Папова і Танева прадаўжаюць трымаць у зняволенні. Рэзалюцыя патрабуе, каб іх неадкладна вызвалілі і прадастаўленне ім права выехаць з Германіі.

✦ Друк паведамляе з Афін, што Балгарыя афіцыяльна адмовілася далучыцца да пакта балканскіх краін. У газетах падкрэсліваецца, што адмаўленне Балгарыі не выклікае здзіўлення і было прыня та пад увагу пры выпрацоўцы пакта.

✦ Паводле афіцыяльных даных у Бразіліі на пачатку 1933 года было знішчана ў мэтах павышэння цэн 918.060 тон кавы. З ліпеня 1931 года знішчана ўсяго 1.716.000 тон кавы.

✦ Паводле паведамлення «Асахі» невядомыя, праехаўшыя ў аўтамабілі 25 студзеня ўвечары міма казармы кавалерыйскага палка, зрабілі з рэвальвера чатыры стрэлы ў кірунку казары. Не гледзячы на праследванне, страляўшыя скрыліся. Улады прапанавалі газетам устрымацца ад сенсацыйнага апублікавання гэтага адарэння з прычыны «адсутнасці дастатковых матэрыялаў».

✦ «Дэйлі Уоркер» публікуе рэзалюцыю ЦК компартыі ПАЗІП, у якой ЦК далучаецца да тэзісаў 13-га пленума ВККІ. ЦК пастанавіў склікаць 13-та красавіка 18 партыйны з'езд. Пастаноўлена ўстанавіць штомесячны збор з членаў партыі і арганізаваць рад сходаў для стварэння фонда дапамогі германскай компартыі. ЦК звярнуўся з прывітальнай тэлеграмай да XVII з'езда ВКП(б).

✦ Адкрылася 20 студзеня сесія ЦВК Гаміндана. На сесіі прысутнічаюць 44 з 73 членаў ЦВК. Ва ўступнай прамове Ван Цзін-вей даў характарыстыку затрудненняў ўрада за апошні год, аддаўшы вялікае месца «комуністычнай небяспецы» і фуцзянскаму паўстанню.

✦ Згодна паведамлення газеты «Лідсе новіны», ружэйны завод у Брно «Збраёўка» атрымаў заказ ад «адной азіяцкай дзяржавы» (падразумеваецца Японія) амаль на 100 млн. чэшскіх крон. Гэты заказ забяспечвае завод нагрузкай на цэлы год.

✦ Паводле слоў агенцтва Рэйтэр, у правінцыі Нінся прадаўжаюцца баі паміж войскамі Сун Цзяньіна, атакуючымі пункт Пінло за 30 міль к поўначы ад горада Нінся, і войскамі губернатара гэтай правінцыі Ма Хун-куя. Абодва генералы адмаўляюцца падпачаліцца загадам Нанкіна аб спыненні варожых дзеянняў.

На думку «Чэнбао», ваенная акцыя Сун Цзян-іна падтрымліваецца «замежнай дзяржавай», і калі дапусціць развіццё гэтай авантуры, то наўторыцца «плачэўны манчжурскі інцыдэнт у паўночна-заходнім Кітаі».

ВЫКАНАЦЬ ПЛАН ЛЕСАВЫВАЗКІ

Неадкладна ліквідаваць паглыбляючыйся прарыў

Прарыў у лесазагатоўках і вывазцы паглыбляецца. План ЗАГАТОЎКІ дзелавой драўніны першага квартала на 20 студзеня выкананы на 18 проц., дроў — на 12,1 проц. План ВЫВАЗКІ дзелавой драўніны выкаканы на 14,7 проц., дроў—на 17,6 проц. Між тым увесь студзень павінен даць не менш 40 проц. квартальнага плана і па загатоўцы і па вывазцы. А першыя дзве дэкады, г. зн. ДЗВЕ ТРЭЦІ месяца, не даюць нават паловы месячнага плана.

Асабліва кепска працуюць леспрамгасы ГЛУСКІ, ЕЛЬСКІ, КРУПСКІ, ЛЕЛЬЧЫЦКІ, ЛЕПЕЛЬСКІ, РАГАЧОЎСКІ, СЯРОЦІНСКІ і СУРАЖСКІ. Працуюць кепска таму, што БОЛЬШАСЦЬ раённых арганізацый прадаўжае ігнараваць загатоўку і вывазку лесу. Раённыя арганізацыі ў лепшым выпадку патрабуюць справаздачы леспрамгаса, але не аказваюць яму канкрэтнай дапамогі, не рэагуюць на шматлікія выпадкі невыканання дагавораў, заключаных паміж калгасамі, адзіначобнікамі і леспрамгасамі. ДАГАВОР НЕ СТАЎ ЯШЧЭ АСНОЎНАЙ ЗБРОЯЙ БАРАЦЬБЫ ЗА ПЛАН. Большасць раённых арганізацый забыла ўказан не СНК СССР ад 19 лістапада, што «ПРАВІЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ДАГАВОРНЫХ АДНОСІН З КАЛГАСАМІ БЕЗУМОЎНА МОЖА ПОЎНАСЦЮ ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПАТРЭБНАСЦЬ У РАБОЧАЙ І ЦЯГАВАЙ СІЛЕ УСІХ ЛЕСАРАСПРАЦОВАК». Неразуменне значэння дагавору настолькі вялікае, што ў радзе раёнаў кіруючыя арганізацыі прымушаюць леспрамгасы па некалькі раз перазаключаць дагаворы, спрыяючы паглыбленню прарыву ў лесавывазцы. Напрыклад, ЗАСЛАЎСКІ райвыканком тры разы замацоўваў за леспрамгасам сельсоветы і ўсе тры разы—розныя. Такую-ж канфузію ў некалькі меншым маштабе правялі ЛЕПЕЛЬСКІ, БАРЫСАЎСКІ і інш. райвыканкомы.

Як калгасы і адзіначобнікі выконваюць дагаворы — гэта раённых арганізацый не цікавіць. У радзе раёнаў прадукцыйнасць працы калгасных брыгад вельмі нізкая. У КАСЦЮКОВІЦКІМ леспрамгасе, напрыклад, нормы выконваюцца на 25-30 проц. У БУДА-КАШАЛЕЎСКІМ леспрамгасе адзіначобнікі вывозяць па аднаму кубаметру ў дзень на адлегласці трох кілометраў. Паспяр гэтага яны возяць дровы для сябе. Або ў тым-жа леспрамгасе вальшчыкі выразаюць па 1 кбм. ў дзень на чалавека.

Чаму такая нізкая прадукцыйнасць працы? У чым корань зла? Якія меры прымаць, каб прадукцыйнасць працы павялічыць? Гэтымі пытаннямі таксама ніхто не цікавіцца. Заключылі дагаворы — і з плеч далоў.

Калі-б раённыя арганізацыі глыбей удумаліся ў гэту справу, яны знайшлі-б шмат недахопаў, нават СКАЖЭННЯЎ пастановы СНК СССР ад 19 лістапада. ГОМЕЛЬСКІ леспрамгас, напрыклад, падышоў да заключэння дагавораў вельмі фармальна. Ён не толькі не паставіў дагаворы на абгаворванне калгаснікаў, але ва многіх выпадках аб заключаных дагаворах НЕ ВЕДАЛІ НАВАТ ЧЛЕНЫ ПРАЎЛЕННЯ КАЛГАСА. Прадстаўнікі леспрамгаса проста дагаварваліся са старшынёй праўлення калгаса і абодва падпісалі дагавор. На гэтым канчалася «Мясавая» работа. У рэдкіх-жа выпадках прапрацоўкі дагавора было не мала казусаў. Адзін з работнікаў Гомельскага леспрамгаса ПЕТРАШУНАС так добра «разабраўся» ў пастанове ўрада, што на сходзе калгаснікаў заявіў: «Цяпер будзем працаваць пакоўаму—адзіначобнікі вызваляюцца (!) ад вывазкі лесу, вазіць павінны калгаснікі».

Адсутнасць масавай прапрацоўкі дагавораў на агульных сходах калгаснікаў прывяла ў многіх выпадках да такіх скажэнняў, якія з'яўляюцца РАШАЮЧЫМІ ў выкананні плана і выкрываюць АСНОЎНУЮ прычыну нізкай прадукцыйнасці працы калгаснікаў.

У пастанове СНК СССР гаворыцца зусім ясна: «Увесь грашовы заработак калгаснікаў (уключаючы аплату за работу каня) паступае ў распараджэнне калгаснікаў за выключэннем 20 проц., якія адлічаюцца ў распараджэнне калгаса за рамонт збруі, калёс, сажай і т. д., а таксама аўса, які паступае ў распараджэнне калгаса для пракорму каня».

І далей: «У тых выпадках, калі АГУЛЬНЫ СХОД КАЛГАСА (падкрэслена намі—Р. Б.) вырашае аплочваць калгаснікам за работу ў лесе працаднямі за кошт дахода калгаса, увесь заработак калгаснікаў (уключаючы натуру) павінен паступаць у распараджэнне калгаса, прычым леспрамгас разам з праўленнем калгаса павінен дакладна ўстанавіць норму выпрацоўкі за працадзень. Пры перавыкананні гэтай нормы выпрацоўкі калгаснікам, аплата за перавыпрацоўку поўнасцю паступае ў асабістае распараджэнне калгаснікаў».

У некаторых-жа раёнах (ГОРАЦКІМ, ЧЭРЫКАЎСКІМ і інш.) пытанне часта вырашалася НЕ НА СХОДЗЕ КАЛГАСНІКАЎ, а паміж старшынёй калгаса і прадстаўніком леспрамгаса. Не прымаючы ўдзелу ў вырашэнні гэтага пытання, многія калгаснікі адчуваюць сябе пакрыўджанымі: пераважна, або на суседнім участку калгаснікі атрымліваюць 80 проц. заработку (уключаючы аплату за работу каня, уключаючы натуру, г. зн. хлеб, цукар, крупы, масла, мяса, рыбу), а другая частка нічога не атрымлівае. Усё паступае ў калгас, у агульны кацёл, а за работу налічваюцца працадні. Калі ўлічыць, што ў некаторых МАЛАМОЦНЫХ калгасах вага працадня надзвычайна высокая, калгаснік пры ходзіць к высноваму, што выгадней атрымліваць 80 проц. заработку ў свае распараджэнне. Зразумела, што такія настроі адмоўна адбіваюцца на прадукцыйнасці працы на выкананні плана.

Гэту простую рэч многія леспрамгасы і раённыя арганізацыі прамаргалі.

Частка заключаных дагавораў не мае канкрэтных самазабавязацельстваў. Недастаткова канкрэтна адлюстраваны абавязацельствы леспрамгаса ў адносінах спадарчай дапамогі калгасам. З другога боку—у дагаворах планы загатоўкі і вывазкі не разбіты па дэкадах, не паказаны дзялянкі (Тураўскі леспрамгас, калгас «Хупі'а», заключаў дагавор дзясятнік ГОХМАН).

Зусім недастатковая ўвага аддаецца заключэнню індывідуальных дагавораў з адзіначобнікамі. Замест ГЛЫБОКАЙ РАСТЛУМАЧАЛЬНАЙ РАБОТЫ некаторыя прадстаўнікі леспрамгасаў прабуюць узяць камандаваннем, адміністратыўным націскам праз сельсоветы. Такія метады даюць якраз адваротныя вынікі. З другога боку—у адносінах адзіначобнікаў, якія заключылі дагаворы, але не выконваюць іх, не прымаецца неабходных мер уздзеяння, не гледзячы на тое, што дагаворы маюць абавязковую юрыдычную сілу і пра дугледжваюць адказнасць абодвух бакоў за іх выкананне.

Ва ўсіх гэтых скажэннях і недахопах вінаваты, зразумела, у першую чаргу леспрамгасы. Але значную частку віны нясуць і раённыя арганізацыі—райкомы КП(б)Б, РВК і райпрофсаюзы. У большасці выпадкаў яны не толькі не дапамагаюць леспрамгасам, але часта мабілізуюць работнікаў леспрамгасаў на іншыя кампаніі, аслабляючы і без таго слабы апарат. Рэчыцкі райком партыі (сакратар т. РЫЖЫКАЎ), у якога справы з загатоўкай і вывазкай лесу далёка не бліскучыя, адзывае з леспрамгаса старшыню райкома саюза, мабілізаваўшы яго на ільназагатоўкі. Такзама паступілі Бялыніцкі, Чэрыкаўскі і Петрыкоўскі райкомы партыі, мабілізаваў адразу двух работнікаў леспрамгаса — старшыню рабчкома Ульмішэка і культработніка Эпштэйна, і паслаў іх на пашпартызацыю. Быхаўскі райпрофсавет (старшыня т. ГЕНКІН) чамусці парашыў узмацніць профапарат саюза каапераціі і дзяржгандлю за кошт намесніка начальніка ОРС'а Быхаўскага леспрамгаса тав. ХАЙКІНА, не гледзячы на тое, што ОРС'ы ў леспрамгасах АСАБЛІВА ЗАРАЗ з'яўляюцца адным з асноўных вагароў выканання плана. Груба ігнаруецца пастанова СНК і ЦК КП(б)Б ад 6 лістапада, у якой сказана: «КАТЭГАРЫЧНА ЗАБАРАНІЦЬ УСІМ РК КП(б)Б І РВК НА ЧАС АСЕННЯ-ЗІМОВАЙ ВЫВАЗКІ АДРЫВАЦЬ РАБОТНІКАЎ ЛЯСНОГА АПАРАТА НА ВЫКАНАННЕ ІНШЫХ РАБОТ».

***

Адсутнасць неабходнай увагі з боку раённых партыйных, совецкіх і прафсаюзных арганізацый, адсутнасць канкрэтнай дапамогі леспрамгасам, далёка недастатковая барацьба за правільнае ажыццяўленне дырэктыў партыі і ўрада аб арганізаваным наборы рабочай сілы і цягі для дровалесазагатовак і вывазкі, за стварэнне стымула для росту прадукцыйнасці працы на лясных участках—вось асноўныя прычыны прарыву. Трэба неадкладна дабіцца рашучага пералому. КОЖНАЯ ГАДЗІНА ДОРАГА. Абавязацельствы, узятыя раённымі арганізацыямі да XVII з'езда партыі, павінны быць поўнасцю выкананы!

Р. Б.

Умовы прыёма на гадовыя курсы марксізма-ленінізма

Курсы марксізма-ленінізма, арганізуемыя пры ЦК КП(б)Б, ставяць задачай падрыхтоўку і перападрыхтоўку кіруючых партыйных работнікаў гарэкомаў, райкомаў і буйных парткомаў і парткалектываў, кіруючых КСМ работнікаў і работнікаў друку.

На курсы марксізма-ленінізма прымаюцца таварышы, якія адказваюць наступным патрабаванням:

а) маючыя не менш 5 год партстажа.

б) маючыя не менш 3-х гадовы стаж кіруючай партыйнай работы (у райкоме, парткоме, парткалектыве).

в) маючыя агульнаадукацыйную падрыхтоўку ў аб'ёме СПШ (двухгадовай).

г) ва ўзросце не старэй 40 год.

д) Комсамольскія работнікі павінны мець не менш 3-х гадовы партстаж не менш 5 год комсамольскага стажа і не менш 3-х год вопыта кіруючай комсамольскай работы (сакрат. ГК, РК, заворг, культпроп, сакратар буйнага комсамольскага калектыва — прам. прадпрыемства);

е) газетныя работнікі — партстаж не ніжэй 5-год і стаж практычнай работы—3 гады (рэдактары газет, заг. аддзял. рэд. шматтыражак прадпрыем.).

Адбор і зацвярджэнне кандыдатаў на курсы марксізма-ленінізма робяць гаркомы і райкомы ў адпаведнасці з развёрсткай, прадстаўленай раёнам.

Пачатак заняткаў на курсах устаноўлен з 15-га лютага 1934 года. На адабраных кандыдатаў неабходна прадставіць у культпроп ЦК КП(б)Б наступныя дакументы:

а) Заяву камандыруемага з кароткай заверанай аўтабіяграфіяй;

б) водзыў і камандыроўку гаркома — райкома;

в) даведку аб праходжанні чысткі;

г) копію вайсковага дакумента і даведку аб становішчы здароўя.

Выдзеленыя таварышы накіроўваюцца ў распараджэнне ЦК толькі пасля паведамлення аб іх прыёме. Прынятыя на курсы павінны цвёрда пераварачуць камісію пры курсах для вызначэння іх узроўня палітычнай і агульнаадукацыйнай падрыхтоўкі.

На курсах слухачы забяспечваюцца: інтэрнатам і стыпендыяй у суме — 250 руб. Сем'і слухачоў вызлічваюць плошчай не задавальняюцца. Мясцовыя партарганізацыі павінны выхоўваць за сям'ёй камандыруемага на курсы кватэру і снабжэнне

Навучальны план курсаў наступны:

Соцыяльна-эканамічныя дысцыпліны

Палітэканомія	120	гадз
Эканомпалітыка	100	„
Гісторыя ВКП(б)		
Ленінізм	160	„
Гісторыя Комінтэрна	40	„
Гістмат	80	„
Гісторыя Расіі і СССР	140	
Чарговыя задачы партыі і партбудаўніцтва	60	„
	700	гадз.

Агульна-адукацыйныя дысцыпліны

Родная мова	120	гадз.
Матэматыка	130	„
Прыродазнаўства	140	„
Геаграфія (фізічн. і экан. з асвятлен. эканомікі краю, рэспублікі)	80	„
	470	гадз

Спецыяльныя дысцыпліны

Эканоміка прамысловасці	120	гадз.
Асновы прамысловай тэхнікі	80	„
Арганізацыя вытворчасці і працы ў прамысловасці	120	„
Асновы агратэхнікі	60	„
Арганізацыя вытворчасці ў калгасах і саўгасах	100	„
	480	гадз

ПАВЕДАМЛЕННІ

Рэспубліканская камісія па чысткі КП(б)Б паведамляе, што з 1 па 25 студзеня г.г. у 10 гадзін раніцы, у гор. Менску (Дом урада, правае крыло, другі паверх, пак. № 266) будзе засядаць рэспубліканская камісія па разгляду апеляцый на пастановы Менскай гарадской камісіі, наступных таварышоў:

27 СТУДЗЕНЯ Ў МЕНСКУ

Ерухімаў Е. К. (парт'ячэйка варгаса), Лодзер Г. І. (парт'ячэйка сталовай № 1), Немельман Х. Л., Муша А. Е. (парткалектыў ВКСГШБ), Мельцэр М. Г. (парткалектыў хлебакамбината), Плісіна В. А. (парт'ячэйка ВКСГШБ), Ламацёў С. М. (парт'ячэйка Ільнатрактарацентра), Курлянд І. С. (парткалектыў Белкаапсаюза), Гаўроп І. О. (п/яч. ЦСПСБ), Зелянецкі З. Л. (п/яч. Торф факультэта), Лейкінд Я. М. (п/яч. Плодагародны трэст), Арысман Ф. Я. (п/яч. завода «Пролетарый»), Ельны Г. Ф. (п/яч. «Комунар»), Хрушкі І. І. Гіршбейн Б. Н., Свабодзін М. Б., Запесоцкі М. С., Габрыель І. В. (п/яч. ВКСГШБ), Мікалоеня М. Ф. (п/яч. БДУ), Маньковскі Ф. І. (п/яч. БОЙКО), Яшкевіч А. Б. (п/яч. Эльвода), Ландус Г. Х. (парт'яч. курсаў тэхнік. БМА), Маскалеў Г. П (п/яч. Ільнатрактарацентра), Картавы Г. В. (п/к. школы «КіМ»), Ідэльсон Л. І. (п/к. фабрыкі «Окцябр»), Заусцінскі В. Ю. (п/к завода «Комунар»), Захараў В. П. (парт'яч. цэгельні № 8), Ермак К. Я. (п/яч. політэхнічнага інстытута), Роўпа І. К. (п/яч. пажарнай каманды), Вараб'ёў І. П. (п/яч. БКС), Выдрук Н. Я. (п/яч. службы шляху), Васілеўскі Н. Я. (п/кал. Гаржылсаюза), Беленькі Ю. А. (фабрыка імя Фрунзе), Блаер Я. (белпрамбуд), Бейненсон Г. В. (п/яч. хлебканторы Белгандлю), Бандарчык А. А. (п/яч. завода стандартных дамоў), Бейненсон Б. В. (п/яч. прац. аспеты), Аўласко Ф. Ф. (п/яч. Наркамсобраба), Астрахаў С. Л. (п/яч. Паперняннскага сельсовета), Рыўтін Х. М. (п/яч. фабрыкі «8-та сакавіка»), Песіна Х. А. (п/яч. ЦСПСБ), Пятроўн С. Ф. (п/яч. Белсадагародтраста), Пянсон Х. А. (п/яч. цэгельні № 1). Новікаў П. П. (парт'яч. рэдакцыі «Звязда»), Мадрухоўч М. Л. (п/яч. медінстытута), Розман В. М. п/к за воды імя Варашылава), Малюкоўская Б. С. (п/яч. арцелі імя Крупскай), Шафір І. Л. (п/к Белкаапсаюза), Шапавалаў П. Г. (Упоўнаркомсоўгасаў) Ламейка М. М. (Плешчаніцы).

28 СТУДЗЕНЯ Ў МЕНСКУ

Івашчонак М. А. (п/яч. Наркаса), Падальніцкі С. П. (п/яч. Наркамасветы), Маргелаў С. П. (п/яч. АНБ), Канашэвіч М. Ф. (Барысаўскі раён), Пятроў М. (Суражскі раён), Грэйковіч Л. С. (п/яч. Службы эксплаатацыі), Вітко ў І. Т. (п/яч. Хімфармазавода), Левін Л. М. (п/яч. Спецбанка), Хейфец (п.-яч. Упаўкамзат), Аснін п.-яч. Белдзяржгаз), Сонкін Д. І. (п.-яч. БСК), Гурскі А. І. (п.-яч. № 11), Кажушко А. А. (п.-яч. № 11), Мооваў Д. П. (п.-яч. Белжылсаюза), Пыжык Е. Г. (п.-яч. Белпладагароднінта), Чулюўская А. А. (п.-яч. ЦСПОБ), Рагуновіч С. В. (п.-яч. НКЮ), Яскевіч Ф. М. (п/яч. соўтаса «Комсамолец»), Герасімовіч Е. Ф. п/яч Трасцянецкай МТС), Емчанко А. К. п/яч. ЦСПОБ), Карнеева Н. І. (п/яч. трамвайнага парка), Капіроўская С. М. (парткалектыў фабрыкі «Окцябр»), Кізіла О. Ф. (п.-к фабрыкі «Окцябр»), Гіцавіч А. І. (п/к Службы шляху), Ерэменко З. Н. (Гомель), Хажавец А. П. (п/к завода імя Молатава), Арабкіна І. Ф. (п/яч. № 13), Рудкоўская М. С. (п/яч. Чырвонага Крыжа). Бегамолаў Д. С. (п/яч. дэпо Асіпавічы), Запольскі Н. І. (Пухавіцкі раён), Наўсыцін І. М. (п/яч. Калодзішчанскі радыёстанцыі), Глухоўскі І. О. (Мазырскі раён), Кін-Камінскі К. І. (п/яч. Белзагатскот), Левін сон А. М. (п/яч. завода «Большэвік»), Круцелёва Н. М. (п/яч. медінстытута), Казлоў Г. З. (п/яч. Упаўнаркомсоўгасаў), Вайнтруб І. М.: (п/яч. фабрыкі «8 сакавіка»), Мелзве дзеў І. Т. (п/я. цэха № 5), Пісьман К. Б. (п/яч. лямцавай фабрыкі), Клімкоў В. Р. (п/к аўтарамонтных майстэрань), Лоўзін А. Ф. (п/яч. малочных кіслот), Лучышын А. Ф. (п/яч. Наркамлестпрома), Літвінаў Н. П. (п/яч. ашчадкасы), Форын І. Д. (п/яч ЦСПОБ), Файнштэйн З. М. (п/яч. яўрэйскага дзяржтэатра), Малочко І. С. (п/яч. Салтаводн. ін-т), Авілін П. І. (п/яч. Саюзмаслапрома), Сапэйн І. І. (п/яч. нервовай клінікі), Кацеенко А. А. (п/яч. вагон. дэпо), Ласко В. В. (п/яч. соўтаса імя Будзённага), Іваноўскі В. А. (п/яч. Замастоцкага сельсовета).

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 29-1-1934 г. у гор. Слуцку будуць разглядацца партправы Слуцкага, Любаньскага і Стара-Дарожскага раёнаў на парткамісіі ЦКК наступных т. т.:

Слуцкі раён:

Тэкліка Р. М., Усовіча Ф. Я., Расамахо Х. А., Гарбаценка Н. К., Рубінчык М. Х., Смірнаў І. Е., Каласкова Г. М., Жыткевіч І. П., Капельсон Ул Е., Філічык. К. Т., Рабкін Л. І., Ландау, Калач В. К., Пратасеня М. І., Мелешко С. П., Корзук П. І., Ермаловіч І. Е., Глазуноў В. Н., Зобкова Р. Г., Церашонка М. Л., Данькова І. А.

Любаньскі раён:

Кашляк-Сцітаная І. С., Сімянка І. С., Грысько. П. Р., Ермалов І. У., Шэйко В. М., Мяцел А. М Гузава І. Б., Сазонаца А. І., Шы А. І.

Стара-Дарожскі раён:

Духажыльніцкаў С. С., Хаўстов Х. С., Дубаўк І. М., Фрыдляндз Х. В., Татырык В. Н.

Яўка пералічаных т. т. абавязкова. Выкліканыя павінны мець пры сабе водзывы парт'ячэек аб апошняй сваёй рабоце.

Парткалегія.

Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 31 студзеня ў гор. Копылі будуць разглядацца партправы наступных таварышоў парткамісіі ЦКК КП(б)Б.

Капыльскі раён:

Паўлюнчык П. І., Зянькоўч В. А Гурыч П. Ф., Гаражан Ан. М., Філічук П. Р., Гетманчык І. Ф., Расадзін П. М., Сыбін М. Ф., Асселья Х., Сулатуб А. С., Ракоўскі І. К., Дубаў П. Ф., Траяновіч А. І., Пасухін Н. Л., Праім І. С., Місточэнко П. М Прашгевіч М. А., Радзюк Г. Р., Ямянскі А. М., Татуро П. П., Зайцаў В. С., Мазуренко І. Г., Шуры С. З., Рацько І. І., Авточчык І. Г.

Яўка пералічаных т. т. абавязкова. Выкліканыя павінны мець пры сабе водзывы парт'ячэек аб апошняй сваёй рабоце.

Парткалегія.

Парткалегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што парткамісія ЦКК КП(б) 31-1-1934 г. у гор. Буда-Кашалёве будуць разглядацца партправы наступных таварышаў:

Па Уваравіцкаму раёну:

Зенькоў А. Т., Марчанка А. І. Цішчанка П. М., Мартун З. С., Цярэшчанка Ф. В., Аўраменка С. М Протчанка Г. М., Абрамаў Д. Н., Ічанкаў У. В., Гольдзін М. Н., Ам сеў С. А., Юркаў С. М., Будай В. Ф Півавараў А. М., Лабзнаў М. Ф., Зляпуго С. А., Мешчаніноў Р. В., Ф дасеенка Е. Ф., Сердзюкоў Н. М., Ф лімонаў Н. А.

Па Буда-Кашалёўскаму раёну.

Алейнікаў Ф. М., Самусаў Я. Ф Гаўрыленко М. А., Новікаў А. Я Цераховіч А., Кашлачоў Н. І., Чучкоў М. І., Ясінскі А. Н., Харытанка П. Р., Рыгкевіч С. Г., Прусс Н. Т., Чарняўскі А. Р.

Яўка пералічаных таварышоў абавязкова. Выкліканыя павінны мець пры сабе водзывы парт'ячэйкі аб апошняй сваёй рабоце.

Парткалегія.

29-і па Сенненскаму раёну:

Акличыць К. М., Барсукоў Б. Д Матучы Аляксей Н., Куніцкі Антон Міхалькоў Е. З., Вярыгінаў М. Д Кірпічоў Я. І., Гімпельсон Г. Я Скакун І. В.

29-і па Лепельскаму раёну:

Парахонько Л. П., Вашук П. М Гайсенко М. М., Сімановіч А. І., Власоў Л. Л., Берасценя Р. І., Сіко ноў І. П.

29-і па Горацкаму раёну:

Сабалеўскі М. І., Блінкоў Ф. Т Фінапуціна А. Н., Лаўрэнаў Г. А Бутадынік П. А., Кулямпова С М Ганкін М С., Севяцьянаў А. А Казлоў А. Р., Кальў Н.В., Прудніка К. М., Лепцюеў Я. К., Благачынны П. М., Тукман А. А., Селякоў М. В., Максуеў І. Ф., Анцупаў Н., Клімеенкоў М. І.

Яўка пералічаных т. т. абавязкова. Праезд ім аплачваецца.

Парткамісія ЦКК

ПК ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 28 і 29 студзеня г. г. з 10 гадз. раніцы ў гор. Оршы (памяшканне РАЙКК РСІ) будзе праводзіць выязная парткамісія ЦКК КП(б)Б па разгляду партправаў наступных т. т.

28-і па Аршанскаму раёну:

Прашчер П. І., Савінкі Ф. М., Юхвідзін У. А., Герашчанка Т. Д Давыдзенкаў Н. У., Гіцін У. С., Сіўцоў У. П., Чолкін Я. М., Гулцоў В. А., Аўраменка А. У., Бетура П. П., Шкляроў І. П., Балдзенка М. Н., Янюўская С. В., Кунцевіч К. Г., Грынюўскі С. М., Аўдзеў П. Т., Тарасава (заг. аршанскай базы сувязі), Ласкін М. І.

28-і па Талачынскаму раёну:

Тачыліна Е. Д., Дубоко П. Л Шэвелёў Я. А., Каралёў С. В., Сямёнаў У. М., Кузеў С. П., Борвенкаў Р. А., Захараўіч Д. Н., Салтановіч Д. З., Фралоў В. С., Сердзюкоў С. І Макараў А. Х., Пасюцін С. Р., Кубарскі Е. З., Курлыша У. М., Лазарэва М. В., Леанові Р. М., Мертцінаў Г. В., Крыжэўскі Д. В., Ваўчок Д. А.

28-і па Дуброўенскаму раёну:

Шыркуноў С. Ф., Лазарын Я. І. Пырко С. Я., Талкачоў І. В., Самонова Н.

29-і па Мсціслаўскаму раёну:

Іваноў М. Н., Красоўскі П. Ф Аўрэменка А. С., Гоманенка П. І. Макаровіч С. А., Масякін Н. С., Снакоў В. П., Аўчынікаў А. В., Пшыгакоў П. А., Пудзікава Г. С., Ісачэнка М. П., Цітоў М. Д., Пяўлюшэнка А. Н., Кудалёў А. П., Ісачэнка М. К Іўковіч А. А., Аўроменка М. І.

29-і па Чашніцкаму раёну:

Галкоўскі П. С., Якупаў Е. А Занько А. З., Дудко Вас. К., Прахольскі Л. А., Сімука Г. А., Пужыла (Заяка) Ф. А., Дземенцьеў С.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСК

ПЕРШЫ ДЗЯРЖ. ТЭАТР (БДТ—1)
28 студзеня—адкрыты спектакль
„МІЖБУР'Е“
Пачатак у 8 гадз. веч.

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“
Ад 25 студзеня
замежная мастацкая драма ў 8 частках
СКАМАРОХ
У галоўных ролях
ЭРНЕСТ ТОРЭНС, НЕЙЛЬ ГАМІЛЬТОН І ЛУІЗА ДЯГРАНЖ.
— У ПРАГРАМЕ —
КІНО-ХРОНІКА САЮЗКІНО № 22
Пачатак 1-го сеанса ў 6 гадз.
КАСА—з 4-х гадзін.

Кіно-тэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“
Ад 25 студзеня замежны мастацкі фільм
ПАТОМКІ ПІРАТАЎ (ПІРАТЫ І ЛОРДЫ)
ДРАМА ў 8 частках.
У галоўных ролях: МЭЙ МУРЭЙ